ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дармовым дадаткам „Прафрух“)

На 1 мес. . . — 90 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагародніх абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. надбаўкі.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ЗЬВЯЗДА

ПРАЛЕТАРЫ ВСЕХ КРАЇН, ЗЛУЧАЙЦЕСЬ!

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
» абвестак . . 7-81

НЯДЗЕЛЯ, 4 мая 1930 г.
№ 102 (3700)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

1-га Мая ў капіталістычных краёх

Ня гледзячы на крывавы тэрор, мільенныя масы пралетарау выйшлі у дзень 1-га Мая на вуліцу

Магутныя дэманстрацыі і масавыя палітычныя забастоўкі--пад баявымі лёзунгамі кампартыі

Сталіцы многіх буржуазных дзяржаў прадстаулялі узброены лягер

Чуцён поступ баявых калён

41 баявая пралетарская маёўка прайшла. Скончыўся першамайскі агляд сіл міжнароднай пралетарскай рэвалюцыі.

Нялоўныя весткі, якія мы зараз маем, ужо даволі выразна характарызуюць гэты агляд і дазваляюць нам падагуліць некаторыя яго вынікі.

Першамайскае сьвяткаваньне, якое адбылося ва ўмовах абвостранага крызісу і нарастаючага рэвалюцыйнага ўздыму, зьявілася ня толькі выразным адлюстраваньнем гэтага ўздыму, але яно таксама гаворыць аб тым, што гэты **рэвалюцыйны ўздым пераходзіць на вышэйшую ступень.**

Яшчэ больш, чым у дні мінулых баявых пралетарскіх выступленьняў, крывавыя Пэргібэлі напярэдадні 1-га мая і ў гэты дзень прылажылі сваіх сіл для таго, каб не дапусьціць першамайскіх выступленьняў. Увесь вялізарны апарат буржуазнай дзяржавы быў мабілізаваны для гэтай мэты. У цэнтральныя гарады былі прывезены паліцэйскія з раёнаў (напрыклад, у Парыж прывезена 10 тысяч паліцэйскіх). Паліцэйскія былі ў гэты дзень узброены навейшымі прыладамі забойства і зьнішчэньня, газавымі бомбамі, газавымі рэвальвэрамі і г. д.

Магутны паток рэвалюцыйнага пралетарыяту парваў усе гэтыя перашкоды. Пралетарыят упарта змагаўся за вуліцу. У шматлікіх гарадох пралетарыят ужо заваяваў вуліцу. Выйшлі пад чырвонымі сьцягамі камуністычных партый, баставалі па іх закліку мільённыя пралетарскія масы.

1-е мая гэтага году паказала, што камуністычныя партыі напярэдадні выращэньня тэй асноўнай задачы, якую перад імі паставіў нэлы рад пастаноў кангрэсаў і пленумаў Камінтэрну, **задачы—заваёвы большасьці рабочае клясы.**

Асабліва паказальнымі і характэрнымі зьяўляюцца падзеі ў **Нямеччыне** ў гэты дзень. У Бэрліне баставалі бадай ўсе буйныя прадпрыемствы. У дэманстрацыі ў Бэрліне прымала ўдзел 200.000 чалавек. Трэба адзначыць, што гэтая дэманстрацыя зьяўляецца большай нават у параўнаньні з вялізарнымі дэманстрацыямі бэрлінскага пралетарыяту ў дзень 6-га сакавіка і 1-га жніўня. Першамайскія сьвяткаваньні ў Бэрліне зьяўляюцца вялізарнай перамогай ня толькі кампартыі Нямеччыны, але сусьветнага пралетарыяту. Красамоўны ўжо самі лічбы 200.000 і 40.000 (лік удзельнікаў камуністычнай дэманстрацыі і сацыял-дэмакратычнай). Да гэтага трэба прыняць пад увагу, што ў камуністычнай дэманстрацыі прымалі ўдзел пераважна рабочыя, работніцы, а ў сацыял-дэмакратычнай пераважна служачыя, а нават і дробная буржуазія, ужо не гаворачы аб іншых характэрных рысах гэтай дэманстрацыі.

Першамайскае сьвяткаваньне ў іншых гарадох Нямеччыны таксама адбывалася пад знакам вялізарнага трыумфу камуністычнай партыі і катастрафічнага паражэньня сацыял-фашыстых. Камуністычная партыя Нямеччыны выконвае адну з галоўнейшых задач камуністычнага руху—яна ня толькі атрымала доступ у буйныя прадпрыемствы, яна ўжо заваявала пад свае сьцягі большасьць рабочых гэтых прадпрыемстваў. Аб гэтым гаворыць той факт, што рабочыя амаль што ўсіх буйных прадпрыемстваў Бэрліна баставалі ў гэты дзень.

Нават буржуазны друк прымушаны прызнаць гэты вялізарны трыумф кампартыі. «Кёльнішэ Цэйтунг» адзначае, што камуністычная дэманстрацыя ў Бэрліне была ў многа разоў большай, чым сацыял-дэмакратычная. Каталіцкая нямецкая газэта «Гэрманія» зьмясьціла нават такі характэрны загаловак над справаздачай аб 1-м мая: **«Камуністыя наперадзе».**

Гэтыя падзеі выразна характарызуюць тую ступень, на якую зараз перайшоў парастаючы рэвалюцыйны ўздым.

Характэрнымі для палявеньня рабочых мас, для страты ўплыву сацыял-фашыстых на іх зьяўляюцца падзеі, якія адбыліся ў дзень 1-га мая **ў Бэльгіі.** У гэтым краі, дзе рабочы рух да нядаўняга часу знаходзіўся пад пераважаючым уплывам сацыял-фашыстых, у рэвалюцыйных дэманстрацыях, якія кампартыя арганізавала, прымала ўдзел шмат тысяч чалавек. **У Льежы і Антвэрпэне адбыліся крывавыя баі з паліцыяй, пры якіх паранена некалькі дзесяткаў рабочых.** Аб падобных падзеях ужо дзесяткі год ня чула гісторыя бэльгійскага рабочага руху. Яны выклікалі замяшанасьць сярод бэльгійскай буржуазіі і яе с.-д. лёкаяў. Першамайскія забастоўкі ў Бэльгіі ахапілі ўсе прамысловыя раёны, асабліва раёны горнай прамысловасьці.

Да авангардных калён наступаючага пралетарыяту далучаюцца адсталыя сялянскія і калёніяльныя рэзэрвы.

Першамайскія сьвяткаваньні ахапілі шырокія гушчы рэвалюцыйнага сялянства капіталістычных краін. У цэлым радзе капіталістычных краёў адбыліся шматлікія рэвалюцыйныя сялянскія дэманстрацыі. Асабліва паказальнымі для рэвалюцыйных настрояў шырокіх масаў рэвалюцыйнага сялянства зьяўляюцца рэвалюцыйныя сялянскія дэманстрацыі ў Польшчы (у Замбкавіцах, Чэрнышыне і г. д.).

Сяляне ўпарта змагаліся з паліцыяй. Сяляне тысячамі ішлі ў пралетарскія асяродкі і прымалі ўдзел у пралетарскіх дэманстрацыях.

Яшчэ ніколі ў багатай рэвалюцыйнай 40-гадовай гісторыі першамайскіх сьвяткаваньняў яны ня мелі такога сапраўды сусьветнага, міжнароднага характару, як у гэтым годзе. Першамайскія забастоўкі і дэманстрацыі адбыліся літаральна ва ўсіх куткох зямное кулі. Першамайскіяу выступленьні адбываюцца ўжо ня толькі ў краёх з разьвітым рабочым рухам, з моцнай кампартыяй — першамайскія сьвяткаваньні адбываюцца таксама ў прыгнечаных імпэрыялізмам калёніях. Так, напрыклад, адбыліся дэманстрацыі і забастоўкі ў калёніі францускага імпэрыялізму ў Індакітаі, дзе ў Банoі «цывілізаваныя» імпэрыялістыя забілі ў часе першамайскай дэманстрацыі 5 чалавек тубыльцаў і шмат паранілі, у амэрыканскай калёніі—Філіпінах, дзе прымалі ўдзел некалькі тысяч і інш.

Усё гэта гаворыць аб тым, што на штурм імпэрыялізму падымаюцца мільённыя гушчы каляровых нявольнікаў капіталу.

Пры паяўнасьці непасрэдна навіслай небясьпекі вайны з Савецкім Саюзам—пралетары і працоўныя ўсяго сьвету дэманстравалі сваю найлыбейшую адданасьць сацыялістычнай бацькаўшчыне сусьветнага пралетарыяту—Савецкаму Саюзу, сваю гатоўнасьць у кожную мінуту стаць у абарону СССР. Усюды па чырвоных пралетарскіх сьцягах красаваліся надпісы ў абарону СССР — «Рукі прэч ад Савецкага Саюзу».

Ідуць баявыя калёны, ідуць наперад, на штурм крэпасьці капіталізму.

ПРАЛЕТАРЫЯТ ЧЫРВОНАГА МЕНСКУ НА 1 МАЙСКАЙ ДЭМАНСТРАЦЫІ



На пляц Волі

Крывавыя сутычкі ў рабочых цэнтрах Польшчы

Рабочыя раёны і ваколіцы Варшавы прадстаўлялі ваенны лягэр

Ня гледзячы на шалёны тэрор, рабочыя абаранілі сваё права на вуліцу

ВАРШАВА, 2. Ня гледзячы на мабілізацыю ўсіх паліцэйскіх сіл, ня гледзячы на нячуваныя па сваіх разьмерах перадмайскія арышты і на адкрытыя пагрозы кулямётамі і бомбамётамі, паліцыі не ўдалося сарваць рэвалюцыйных першамайскіх выступленьняў. Паводле паведамленьняў друку, дэманстрацыі адбыліся ва ўсіх асноўных рабочых цэнтрах Польшчы. Рабочыя даючы адпор узброенай да зубоў паліцыі, абаранілі сваё права на вуліцу. Рабочыя раёны і ваколіцы Варшавы 1-га мая рабілі ўражаньне ўзброенага лягеру. Паліцыя прыведзена ў баявую гатоўнасьць: паліцэйскія рэзэрвы былі ўцягнуты ў Варшаву. На паліцэйскіх—каскі. Акрамя вінтовак паліцэйскія ўзброены кулямётамі і газавымі бомбамі. Ва ўсіх раёнах Варшавы на працягу дня, да 7 гадзін вечара, у розных пунктах адбываліся сутычкі дэманстрантаў з паліцыяй. З найбольш буйных дэманстрацый у Варшаве трэба адзначыць дэманстрацыю ў раёне фабрыкі «Паравоз», у якой прымала ўдзел каля 2.000 чалавек. Лявіца пэпэс дэманстравала на галоўнай Маршалкоўскай вуліцы. У дэманстрацыі прымала ўдзел 1.000 чалавек. Дэманстранты разагнаны паліцыяй. Ужо вечарам, каля 7 гадзін, на Грыбоўскім пляцы сабралася каля 1.000 дэманстрантаў. Гэта дэманстрацыя была асабліва жорстка задушана паліцыяй. Паліцыя разганяла дэманстрантаў шаблямі. Рабочыя пусьцілі ў ход каменьні. Параненых тут-жа вывозілі паліцэйскія карэты хуткай дапамогі.

Дэманстрацыя з рабочага раёну Прагі ня была прапушчана праз мост у Варшаву і разагнана паліцыяй. У некаторых мясцох паліцыя пускала ў ход бомбы са сьлязьлівымі газамі. На працягу ўчарайшага дня ў Варшаве зьбіта і паранена некалькі дзесяткаў чалавек.

У ВЛАЦЛАЎКУ дэманстрацыя, наладжаная кампартыяй і пэпэссаўскай лявіцаю, была атакавана паліцыяй. Паліцыя пусьціла ў ход газавыя бомбы.

У САХАЧЭВЕ пэпэссаўская лявіца сабрала пад сваімі сьцягамі каля 2.000 рабочых.

У ЖЫРАРДАВЕ дэманстрацыя пэпэссаўскай лявіцы была разагнана паліцыяй. Рад дэманстрантаў паранены і цяжка зьбіты. Арыштавана каля 100 удзельнікаў дэманстрацыі.

У КРАКАВЕ, ЛОМЖЫ і МЕНСКУ-МАЗАВЕЦКІМ адбыліся таксама дэманстрацыі пэпэссаўскай лявіцы.

Як паведамляюць з ЛОДЗІ, ніколі яшчэ 1 мая горад так не навадняўся паліцыяй, як у сёлетнім годзе. Рабочыя раёны былі акружаны паліцэйскімі атрадамі. Амаль каля кожнага рабочага дому дзяжурыў паліцэйскі. Тым ня менш на двух пляцох адбыліся мітынгі. Паліцыя пайшла ў атаку. Шмат цяжка зьбітых і параненых.

У ЗАМБКАВІЦАХ каля будынку прафсаюзаў рабочых хэмічнае прамысловасьці сабралася ўчора каля 1.000 чалавек. Рабочыя былі тут-жа атакаваны паліцыяй і адціснуты ад зборнага пункту. На дапамогу рабочым прышлі з суседніх вёсак каля 500 сялян, узброеных папкамі. Сяляне разам з сабраўшымися рабочымі арганізавалі дэманстрацыю, да якой па дарозе пачалі далучацца ўсё новыя і новыя групы рабочых. Такім чынам сабралася каля 2.000 чалавек. Дэманстранты былі атакаваны коннай і пешай паліцыяй, але паліцэйскім было аказана энэргічнае супраціўленьне. Паранена звыш 10 рабочых і 4 паліцэйскіх.

Рэвалюцыйная дэманстрацыя адбылася ў раёне капальні ЧЭЛЯДЗЬ. Сабралася каля 4.000 гарнякоў. Атака фашысцкіх дружын, прабаваўшых захапіць партыйныя сьцягі, была адбіта рабочымі. Паліцыя тройчы атакавала дэманстрантаў. Сярод дэманстрантаў шмат параненых, але пацярпелі таксама і паліцэйскія, якім рабочыя далі актыўны адпор. Арыштавана шмат рабочых, якіх жорстка зьбілі ў дэфэнзыве.

У ДАМБРОВЕ адбылася дэманстрацыя, у якой прымала ўдзел каля 1.000 чалавек. Дэманстранты былі акружаны паліцыяй. Сутычкі рабочых з паліцыяй працягваліся ў Дамброве да позьняга вечара. Паранена і зьбіта каля 20 рабочых.

У ВІЛЬНЕ арыштавана каля 200 чалавек.

У САСНОЎЦЫ ў дэманстрацыі прыняло ўдзел каля 6.000 рабочых.

У БЕЛАСТОКУ, ПІНСКУ І ЛЬВОВЕ адбыліся першамайскія дэманстрацыі, якія былі разагнаны паліцыяй.

«Наш Пшэглёнд» паведамляе аб сялянскай дэманстрацыі ў сяле ЧАРНІШЫНЕ, Грубяшоўскага павету. Паводле вестак газэты, сялянская дэманстрацыя, якою кіраваў сельроб, атакавала паліцыю, прычым апошняя дала залп, але страляла, нібы-та, у паветра. Пасьля стральбы сяляне кінуліся на паліцыю і пачалі зьбіваць яе палкамі і каменьнямі. Адзін паліцэйскі паранены каменем, другі цяжка зьбіты. З дэманстрантаў 1 паранены. Адбыліся шматлікія арышты. (ТАСС).

ГАЗАВЫЯ БОМБЫ І КУЛЯМЁТЫ СУПРОЦЬ ДЭМАНСТРАНТАЎ

ВАРШАВА, 1. Паводле падліку газэт, усе дазволеныя ў Варшаве дэманстрацыі сацыял-фашыстых сабралі ад 10 да 12 тысяч чалавек. Паліцыя мабілізавала свае сілы супроць камуністых. Паліцыя была ўзброена вінтоўкамі, газавымі бомбамі. На галоўным пункце, на Банкаўскім пляцы, былі пастаўлены кулямёты. Разганяючы асобныя групы па некалькі сот рабочых, паліцыі ўдалося не дапусьціць галоўных дэманстрацый на Банкаўскім пляцы і разагнаць сабраўшыхся там рабочых. Дэманстранты ўсюды давалі адпор паліцыі, абараняючы свае сьцягі. Сярод дэманстрантаў шмат арыштаваных і зьбітых; паранена каменьнямі трое паліцэйскіх і некалькі тайных агентаў паліцыі. На аднэй з раённых дэманстрацый адбылася рукапашная сутычка паміж жанчынамі-работніцамі і паліцыяй, якая дарэмна прабавала адабраць сьцяг у работніц.

200-ТЫСЯЧНАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ Ў БЭРЛІНЕ

ПОЎНЫ ПРАВАЛ САЦЫЯЛ-ФАШЫСТЫХ

БЭРЛІН, 1. Агульная колькасьць удзельнікаў у дэманстрацыі кампартыі і рэвалюцыйнай прафапазыцыі ў Бэрліне складае **200 тыс. чал.**, з іх каля 120 тыс. прыпадае па дэманстрацыі ў Люстгартэне. На заклік кампартыі адгукнуліся самыя шырокія масы бэрлінскага пралетарыяту. Пераважную большасьць удзельнікаў камуністычнай дэманстрацыі складалі бэрлінскія рабочыя і работніцы; служачыя-ж прымалі невялікі ўдзел. У сацыял-дэмакратаў якраз **назадварот.** Шматтысячнымі атрадамі былі прадстаўлены таксама рэвалюцыйныя спартыўныя саюзы і рабочая моладзь. Асабліва вялікае ўражаньне зрабіў значны атрад саюзу інвалідаў імпэрыялістычнай вайны, сярод якіх вялікая група сьляпых.

З прамовамі выступалі т. т. **Тэльман, Нэйман, Пік і інш.** Пасьля прамоў пры агульным энтузіязьме прысутных была зачытана рэзалюцыя, якую удзельнікі дэманстрацыі віталі воклічам «Рот Фронт». З прычыны таго, што ў Люстгартэне не змаглі зьмясьціцца ўсе жадаючыя, многія дзесяткі тысяч пас[illegible] перапоўнілі прылеглыя вуліцы.

У сацыял-дэмакратычнай дэманстрацыі ўдзельнічала 40.000 чалавек.

Для настрояў удзельнікаў гэтай дэманстрацыі характэрным зьяўляецца той факт, што амаль палова іх пакінула мітынг у самым пачатку дакладу, а таксама і тое, што сацыял-дэмакраты на гэты раз выступілі з чырвонымі сьцягамі і іх музыкі (у большасьці ў сьвяточных цыліндрах) гралі пераважна «Інтэрнацыянал», каб падкрэсьліць «япазыцыйнасьць» сацыял-дэмакратаў.

Усе дэманстрацыі, якія адбыліся ў Люстгартэне, надзвычай выразна выявілі настроі бэрлінскага пралетарыяту. Спробы сацыял-фашыстых проціставіць сваю дэманстрацыю камуністычнай, скончыліся **нячуваным банкрутствам.** Выбраўшы месцам сваёй дэманстрацыі Люстгартэн, пры тым зараз-жа пасьля камуністычнай дэманстрацыі, сацыял-дэмакраты далі дасканалую магчымасьць параўнаць характар і разьмеры абедзьвюх дэманстрацый. **Вынік атрымаўся** для сацыял-фашыстых **катастрафічным.**

Пасьля камуністычнай дэманстрацыі ў Люстгартэне, дзьве грандыёзныя калёны дэманстрантаў накіраваліся—адна ў Вэдынг, другая ў Нэйкёльн. Трэцяя калёна дэманстрантаў пайшла ў Кёпліэрштрасэ да вуліцы, якая пырока вядома, як месца барыкадных баёў у мінулым годзе. Ня гледзячы на тое, што дэманстранты выходзілі з Люстгартэну трымя калёнамі, патрабавалася паўтары гадзіны для таго, каб яны маглі выйсьці адтуль. Калёна, якая ішла да Кёпліэрштрасэ, прадстаўляла сабою вялікае мора чырвоных сьцягаў і плякатаў. Ня было амаль ні аднаго дому, які-б ня быў упрыгожаны чырвонымі сьцягамі. У поперак вуліц былі працягнуты чырвоныя палотнішчы з рэвалюцыйнымі лёзунгамі. Бясконцыя калёны дэманстрантаў на чале з членамі ЦК кампартыі т. т. **Тэльманам і Нэйманам** праходзілі скрозь калёны рабочых пры бязупынных воклічах—«няхай жыве кампартыя», «няхай жыве СССР», «няхай жыве Камінтэрн!»

У Нэйкёльне пралетарскае насельніцтва прыняло такі-ж актыўны ўдзел у дэманстрацыі, як і ў Вэдынгу.

ДЗЕНЬ РАБОЧАЙ МОЛАДЗІ Ў ЛЕЙПЦЫГУ

Наперакор забароне паліцыі дэманструюць калёны антыфашысцкай лігі

МАСАВЫЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ ПА ЎСЕЙ НЯМЕЧЧЫНЕ

БЭРЛІН, 2. Паведамленьні, якія паступаюць з правінцыяльных гарадоў Нямеччыны, паказваюць, што ўдзел рабочых у камуністычных дэманстрацыях у гэтым годзе значна навялічыўся ў параўнаньні з ранейшымі гадамі. У большай частцы гарадоў, дзе адбыліся сац.-дэмакр. дэманстрацыі, камуністычныя дэманстрацыі значна перавышалі іх колькасна. Першамайскія забастоўкі ў правінцыі таксама перавысілі па сваім разьмеры леташнія. Ва ўсіх гарадох, дзе дэманстрацыі былі забаронены, рабочыя ўсё-ж выйшлі на вуліцу. Апрача выступленьняў у **Лейпцыгу і Мюнхэне** дэманстрацыі, ня гледзячы на забарону, адбыліся таксама ў **Пфорцгэйме** (Пфальскі раён у Баварыі) і ў **Казэйр-Ляйтэне** пад Бэрлінам. Ва ўсіх гэтых пунктах паліцыі ўдавалася разагнаць дэманстрантаў толькі пасьля шматразовых нападаў і масавых арыштаў.

У **Верхняй Сілезіі** дэманстрацыі адбыліся на ўсіх цэнтрах і значна перавышалі па сваёй колькасьці леташнія. У **Мэнленбургу** ў камуністычнай дэманстрацыі прымала ўдзел 16.000 чалавек, у **Глейвіцы**—5.000 чалавек. У горадзе Фолькдынгэйне, дзе мясцовая рада прафсаюзаў знаходзіцца ў руках брандлераўцаў, у дэманстрацыі кампартыі прымала ўдзел 1.000 рабочых, а ў суцольнай дэманстрацыі рэфармістых і брандлераўцаў—усяго 200 чалавек. **У Дюсельдорфе** ў рэвалюцыйнай дэманстрацыі прынялі ўдзел 20.000 рабочых, **у Эсэне**—10.000, **у Дортмунде**—7.000, **у Бахуме**—4.000 і г. д.

У **Ніжня-Рэйнскай вобласьці,** у сярэдняй **Нямеччыне** і ў **Вюртэмбэргу** першамайскія выступленьні прайшлі таксама пад кіраўніцтвам кампартыі і рэвалюцыйнай прафапазыцыі. **У Гальлі** рэфармістыя адмовіліся ад арганізацыі дэманстрацый, прадставіўшы вуліцу толькі камуністым. **У Штутгарце** ў камуністычнай дэманстрацыі прымала ўдзел 10.000 чал. У **Майнгэйне** на чале шматтысячнай камуністычнай дэманстрацыі былі атрады забароненага саюзу чырвоных франтавікоў у поўнай форме. У **Хэмніцы** ў рэвалюцыйнай дэманстрацыі прымала ўдзел 20.000 чал. Нават у Дрэздэне, дзе сац.-дэмакратычная партыя налічвае 70.000 членаў, у сацыял-дэмакратычнай дэманстрацыі прымала ўдзел усяго 7-8 тысяч чалавек, столькі-ж, колькі ў камуністычнай. Сацыял-дэмакратычныя дэманстрацыі праходзілі пад характэрнымі для дэмагогіі «левых» сацыял-дэмакратаў Саксоніі лёзунгамі, сярод, якіх побач з рэвалюцыйнымі лёзунгамі, як напрыклад: «Прэч капіталістычны лад» і «Прэч капіталістычную рацыяналізацыю» фігураваў таксама плякат з надпісам: «Хто пралівае рабочую кроў—камуністычная партыя і фашыстыя».

У Кенігсбэргу ў камуністычнай дэманстрацыі прымала ўдзел 7.000 рабочых,—у чатыры разы больш чым у рэфармістых.

ГРАНДЫЁЗНАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ Ў ГАМБУРГУ

БЭРЛІН, 1. Першамайская дэманстрацыя рэвалюцыйнага пралетарыяту Гамбургу зьявілася пераканаўчым доказам моцнага росту ўплыву і папулярнасьці кампартыі. 4 грандыёзных калёны дэманстрантаў накіраваліся праз рабочыя раёны да пляцу, дзе адбыўся мітынг пры ўдзеле дзесяткаў тысяч рабочых і служачых. Лік матросаў, грузчыкаў і гарнякоў, якія прымалі ўдзел сёньня ў дэманстрацыі, у два разы перавышае лік іх у мінулым годзе. Сярод дэманстрантаў асоба выдзяляліся масавыя пралетарскія арганізацыі—спартыўныя саюзы, арганізацыі бязбожнікаў і інш. У дэманстрацыі прымалі ўдзел шматлікія атрады саюзу чырвоных франтавікоў.

НЯ ГЛЕДЗЯЧЫ НА ЖАХЛІВЫ ТЭРОР, ПРАЛЕТАРЫЯТ ШАНХАЮ ВЫШАЎ НА ВУЛІЦУ

Горад абернуты ва ўзброены лягер

ШАНХАЙ, 1. Ня гледзячы на рэпрэсіі і няспрыяючае дажджлівае надвор'е, у розных часьцях гораду адбываліся дэманстрацыі. На аднэй дэманстрацыі быў падняты савецкі сьцяг. Усе дэманстрацыі разагнаны паліцыяй, якая зрабіла шмат арыштаў. Большасьць фабрык і заводаў спыніла сёньня работу. ГОРАД АБЕРНУТЫ ЛІТАРАЛЬНА ВА ЎЗБРОЕНЫ ЛЯГЕР. Усюды расстаўлены атрады паліцыі, узброенай рэвальвэрамі. Прадпрыемствы, дзе абвешчана забастоўка, узмоцнена ахоўваюцца. (ТАСС).

У ФІНЛЯНДЫІ

ГЭЛЬСІНГФОРС, 2. Першамайскія камуністычныя дэманстрацыі адбыліся ва ўсіх буйных цэнтрах Фінляндыі.

ДЗЕНЬ РАБОЧАЙ МОЛАДЗІ Ў БЭРЛІНЕ

На здымку: дэманструе бэрлінскі камсамол

На заклік кампартыі ў аднэй толькі Парыскай акрузе баставала звыш 300.000 чалавек

ПАРЫЖ, 1. Напярэдадні 1 мая ў Парыжы і прыгарадах сканцэнтравана 10.000 паліцэйскіх і жандараў. Канфіскавана каля 100.000 экз. першамайскіх выданьняў кампартыі і 10.000 лістовак і адозваў. Парыж, як і ў часе 1 жніўня і 6 сакавіка, нагадвае горад, які абвешчан на ваенным становішчы. На дапамогу паліцыі і жандармэрыі ў горадзе згуртаваны значныя вайсковыя часьці з правінцыі, якія знаходзяцца ўвесь час у баявой гатоўнасьці.

Ня гледзячы на страшэнны тэрор, лік удзельнікаў першамайскай 24-гадзіннай забастоўкі ў **Парыскай акрузе** перавысіў 300.000 чал. Забастоўкай было ахоплена **100 проц. будаўнікоў, шофэраў таксі, гарбароў, рабочых тутунёвай прамысловасьці, каля 90 проц. мэталістых, 80 проц. дрэваапрацоўшчыкаў і 60 проц. друкароў.**

Калі прыняць пад увагу мерапрыемствы ўлады, накіраваныя да зрыву забастоўкі, маёўры прадпрыемцаў і сабатаж рэфармістых, дык стане ясна, што пераважная большасьць баставаўшых 1 мая рабочых пайшла за кампартыяй і унітарнымі прафсаюзамі і баставала пад іх кіраўніцтвам і пад іх баявымі лёзунгамі.

Лік арыштаваных дасягае 1.000 чал. Арыштавана звыш 100 чужаземных рабочых, якія высылаюцца заграніцу. Арыштаваны т. **Доры,** намесьнік мэра і камуністычныя дарадцы муніцыпалітэту ў Сэн-Дэні.

Вечарам 1 мая перад турмой **у Саитэ,** якую ахоўвалі 2.000 паліцэйскіх, былі спробы наладзіць дэманстрацыю з патрабаваньнем вызваленьня палітзьняволеных. У часе сутычкі з дэманстрантамі было арыштавана 150 рабочых.

У Сэн-Дэні ў часе разгону рабочага сходу, арганізаванага кампартыяй у закрытым памяшканьні, арыштавана 108 рабочых.

У **Вэрсалі** пад кіраўніцтвам кампартыі адбылася шматлюдная вулічная дэманстрацыя, якая прайшла з вялікім уздымам. На радзе прадпрыемстваў Парыскай акругі з будынкаў камуністычных муніцыпалітэтаў былі вывешаны чырвоныя сьцягі, якія зьнімаліся паліцыяй.

Першамайскія забастоўкі на правінцыі набылі вельмі значныя разьмеры, ахапіўшы ў радзе раёнаў **увесь прамысловы пралетарыят і ўсіх работнікаў мясцовага транспарту.** Ва многіх гарадох адбыліся масавыя дэманстрацыі рабочых пад лёзунгамі кампартыі і унітарнай канфэдэрацыі працы. У **Сэнт-Эт'ене,** дзе адбывалася 100-процантная забастоўка рабочых мэталёвай прамысловасьці і гарнякоў, у часе масавых дэманстрацый арыштавана **6** рабочых.

У **Ліможы** баставалі поўнасьцю ўсе заводы і быў спынены трамвайны рух. Частка магазынаў была закрыта. Ня гледзячы на канцэнтрацыю буйных сіл паліцыі і жандармэрыі, адбылася 3-тысячная дэманстрацыя рабочых па галоўных вуліцах.

У Марсэлі першамайская забастоўка прайшла з вялізарным посьпехам. Пры разгоне дэманстрацыі паліцыяй было арыштавана 12 рабочых.

Як падаюць **з Эльзасу,** у дзень 1 мая баставалі ўсе вугольныя капальні і рудні Мозэрскага басэйну. **У Страсбургу** адбылася арганізаваная кампартыяй і унітарнымі прафсаюзамі 10.000-дэманстрацыя, якая скончылася шматлюдным мітынгам.

У Лілі забастоўка ахапіла, за нямногімі выключэньнямі, усе фабрыкі, заводы, трамваі, аўтабусы і таксі. На вуліцах, перапоўненых паліцыяй, дэманстравала звыш 6.000 рабочых. Аб масавых вулічных дэманстрацыях паведамляюць з **Рубэ, Туркузну,** а таксама з **Сэн-Нэвэры** і іншых месц.

Сэнсацыйныя выкрыцьці бела-эміграцкай газэты аб замаху на паўпрэдзтва

ВАРШАВА, 3. Белаэміграцкая «За свабоду» выступае ў сэнсацыйным артыкуле наконт замаху на наўнамоцнае прадстаўніцтва СССР у Варшаве. «За свабоду» катэгарычна заяўляе: «мы зусім пераконаны, што расійскія эмігранты тут не вінаваты. З гэтага відаць, што да замаху маюць дачыненьне якіясьці іншыя групы эмігрантаў, якія знайшлі прытулак на польскай тэрыторыі. Віноўнікі павінны быць выкрыты, каб раз назаўсёды ачысьціць нездаровую адмасфэру. Мы загадзя зусім адкрыта скажам,—піша «За свабоду», што выкрыць сапраўдных віноўнікаў зусім ня так лёгка па прычынах, аб якіх мы ня можам гаварыць».

Вывады з гэтага артыкулу напрашваюцца самі сабой. Папершае, «За свабоду» наўмысьля падкрэсьлівае, што яна мае пэўныя весткі аб замаху і яго ўдзельніках; падругое з разважаньняў «За свабоду» вынікае, што газэта шукае віноўнікаў замаху ва ўкраінскіх колах. Можна меркаваць, што «За свабоду» паведаміць сьледчым уладам усё тое, што яна ведае, але аб чым ня лічыць магчымым апублікаваць у прэсе. (ТАСС).

6-га мая 1930 г. роўна а 6-ай гадз. увечары ў памяшканьні Дому Камасьветы (б. клюб К. Маркса)

адбудзецца чарговая 3-я раённая партканфэрэнцыя Фрунзаускага раёну

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Даклад ЦКК КП(б)Б—тав. РЫСКІН.
2. Даклад АК КП(б)Б—тав. СЛАВІНСКІ.
3. Справаздача РК КП(б)Б—тав. ШПЭКТАРАЎ.

Судаклады: а) аб рабоце арганізацыі ЛКСМ, б) аб рабоце парттройкі.

4. Даклад рэвізійнай камісіі.
5. Вынікі выканаьня прамфінпляну і сацспаборніцтва ў раёне.
6. Выбары РК, парттройкі, рэвіз. камісіі і дэлегатаў на акруговую партыйную канфэрэнцыю.

Модус дэлегатаў па раённую партканфэрэнцыю: адзін ад 5-ці членаў партыі з пастаноўчым і адзін ад 10-ці кандыдатаў з дарадчым голасам.

Сьпісы дэлегатаў ад ячэек павінны быць прадстаўлены ў РК не пазьней 5-га мая.

Мандаты атрымліваць у РК з 5-га мая з 10-ці да 3-х гадз. дня і з 6-ці да 9-ці гадзін увечары.

ФРК КП(б)Б.

5-га мая, а 6-ай гадз. увечары ў памяшканьні РК КП(б)Б (Энгельса, 28)

адбудзецца чарговы пашыраны пленум Фрунзаускага РК КП(б)Б

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Справаздача бюро РК КП(б)Б тав. ШПЭКТАРАЎ.
2. Пытаньні 3-ай райпартканфэрэнцыі—тав. КІНЭР.
3. Прыём у партыю.

Яўка членаў і кандыдатаў пленуму РК і сакратароў ячэек АБАВЯЗКОВА.

ФРК КП(б)Б.

СЁНЬНЯ, а 6 гадз. увечары скліканецца

Аб'яднаны пленум Мен. АК і АКК КП(б)Б,

З ПАРАДКАМ ДНЯ

1. **Справаздача АК КП(б)Б (т. СЛАВІНСКІ).**
2. **Аб далейшых задачах у галіне калектывізацыі сельскай гаспадаркі (т. ТАМАШЭЎСКІ).**
3. **Вынікі чысткі партарганізацыі т. (ДАМБРОЎСКІ).**
4. **Пытаньні VIII-ай партканфэрэнцыі.**

Сакратар Мен. АК КП(б)Б СЛАВІНСКІ.

Арганізаваць шырокую праверку прасоўваньня крэдытаў непасрэдна да калгасаў

Кожны калгасьнік, кожны бядняк і серадняк павінен ведаць пра дадатковыя ільготы калгасам

Узьнімаючы працоўную дысцыпліну на палёх, перавысім пасеўныя пляны

Калгас імя XII зьезду КП(б)Б—узор для усей Аршаншчыны

Яравы клін пашыраецца на 30 проц.

Прадукцыйнасьць працы вышэйшая, чым у індывідуальных гаспадарках

Калгас імя XII зьезду КП(б)Б (Талачынскі раён) — самы буйны ў Аршаншчыне. Пад яравы клін калгасу адведзена 618 гэкт. На 1 мая калгасам ужо засеяна 27 гэкт. ільну (100 проц. пляну), 40 гэкт. вікі (66 проц.), 25 гэкт. ячменю (61 проц.), 100 гэкт. аўсу (35 проц.), 17 гэкт. яравой пшаніцы (67 проц.) і 7 гэкт. бульбы (3 проц.).

Сяўбу збожжавых культур калгас разьлічвае скончыць да 10 мая. Наогул сяўбу яравых маркуецца скончыць не пазьней 25 мая. Парукай гэтаму зьяўляюцца сапраўды бальшавіцкія тэмпы работы калгасьнікаў. Так, ворыва ў калгасе было скончана 15 красавіка, а баранаваньне — 25 красавіка.

Прадукцыйнасьць працы ў калгасе вышэйшая, чым у індывідуальных гаспадарках. Узьняцьцю прадукцыйнасьці працы і працоўнай дысцыпліны значна спрыяў пераход на зьдзельную аплату працы. Так, у садова-гароднай брыгадзе пасьля ўстанаўленьня зьдзельшчыны прадукцыйнасьць працы ўзьнялася ў два з паловай разы. Такія-ж факты ёсьць і ў іншых галінах гаспадаркі. Толькі брыгада паляводаў яшчэ працуе, як і раней, падзённа.

Пасеўная плошча пад яравымі павялічана ў параўнаньні з мінулым годам (улічваючы і яравы клін новаўступіўшых у калгас) на 30 проц. за кошт скарачэньня папару. Калгасьнікі засяваюць палі выключна гатунковым і ачышчаным насеньнем.

Добра наладжаная работа ў калгасе выклікае прыліў новых бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Калі на 20 сакавіка ў калгасе было 230 гаспадарак, дык на 25 красавіка іх было ўжо 251 гаспадарка. А за апошнія 5 дзён уступіла яшчэ 10 бядняцкіх гаспадарак і 5 батракоў.

У калгасе шырока выкарыстоўваецца гаспадарчы вопыт сераднякоў-актывістых. Кіраўнікамі асобных брыгад, асобных галін гаспадаркі на 60 проц. зьяўляюцца сераднякі, якія маюць вялікі гаспадарчы вопыт. Сераднякі таксама прадстаўлены і ў праўленьні калгасу, праўда, ня ў зусім дастатковай колькасьці. Усё гэта гаворыць аб тым, што кіраўніцтва калгасу здолела мабілізаваць увагу калгасьнікаў вакол сяўбы, здолела арганізаваць работу паўдарнаму.

У заключэньне неабходна спыніцца на тым, што калгас дагэтуль яшчэ не атрымаў крэдытаў на выдачу зарплаты батраком. Раённыя арганізацыі замест таго, каб дабіцца ў акрузе гэтых крэдытаў, пачалі складаць фонд дапамогі батрацтву, шляхам адлічэньня з розных каапэрацыйных і грамадзкіх арганізацый. Але, у выніку з гэтага нічога ня выйшла. Батракі дагэтуль не атрымалі заработнай платы. Раённыя і акруговыя арганізацыі павінны зараз-жа крэдыты для аплаты батракоў давесьці да кожнага калгасу.

Брыгадзір «Зьвязды» МІНОВІЧ.

Пашыраем плошчу пад кармы

Неперавод крэдытаў затрымлівае будаўніцтва ў калгасах

Калгас імя газ. «Зьвязда» (Мазырская акруга) мае ўсе магчымасьці стаць прыгараднай малочнай фармай. Адно тое, што ён знаходзіцца на адлегласьці 7 клм. ад Мазыру гаворыць аб тым, што калгас навінен у найхутчэйшы тэрмін так перабудавацца, каб сапраўды разьвіцца ў буйную малочную фэрму.

Плян веснавой сяўбы ў значнай ступені набудаваны на тым, каб забясьпечыць калгас сакавітымі малакагоннымі кармамі, якіх хапіла-б для пракорму ня менш, чым 300 штук жывёлы.

Калгасам ужо засеяна 28 гэкт. вікі мяшанкі супроць 25 гэкт., прадугледжаных плянам.

Зараз ён прыступіў да сяўбы 50 гэкт. бульбы, 50 гэкт. кукурузы, 25 гэкт. корнеплодаў.

Увесь яравы клін калгасу ў параўнаньні з мінулым годам павялічваецца на 25 проц.

Калгас сустрэўся з радам труднасьцяй на шляху да ажыцьцяўленьня свайго пляну сяўбы. Яму, напрыклад, патрэбна было 500 цэнтнэраў мінэральных угнаеньняў. У свой час іх ня было. Зараз яны прыбылі, але перавесьці іх са станцыі Калінкавічы калгас ня мае магчымасьці (трэба ехаць за 20 клм.).

Хоць калгас і атрымаў ад Нараўлянскага раймалжывсаюзу 9 коняй, але пытаньне аб цягавай сіле ўсё яшчэ застаецца вузкім месцам калектыву. На сваіх конях немагчыма перавезьці такую колькасьць угнаеньняў, акруговае-ж аддзяленьне Аўтадору ня ідзе на дапамогу, лічачы перавозку ўгнаеньняў «нявыгоднай» справай.

Нездавальняючая справа і з будаўніцтвам Дагавор быў заключан у 20-х чыслах з Белкалгасбудам на будаўніцтва скотных двароў і сілосных вежаў. Аднак, прыступіць да будаўніцтва нельга, бо адпаведныя крэдыты яшчэ не пераведзены.

Калгас усё яшчэ ня мае рахункавода, ня гледзячы на тое, што ня раз прасіў аб гэтым акрмалжывсаюз.

Шырока разгорнута ў калектыве праца з беднатой. За паўтара месяца праведзена 6 бядняцкіх сходаў. У выніку наглядаецца вялікая згуртаванасьць беднаты, бадзёры яе настрой і дружная работа ў калгасе наогул. Існуюць таксама ўдарныя групы аратых і сейбітаў.

У апошнія часы наглядаецца прыліў новых членаў у калгас.

Трэба, каб раённыя і акруговыя ўстановы зьвярнулі больш увагі на калгасы.

Аграном МАРКАЎ.

Асьвейскаму раёну не пераведзены крэдыты

Беззваротная пазыка батраком-калгасьнікам Асьвейскага раёну, Полацкае акругі, ня выдана з прычыны непераводу крэдытаў на гэту мэту раённаму крэдытнаму таварыству.

Паводле пастановы СНК, раён павінен быў атрымаць крэдыты на куплю коняй для калгасаў, беднякоў, чырвоных партызан. Гэтыя крэдыты не пераведзены, ня гледзячы на нашу тэлеграфную просьбу да Калгасбанку. Адсутнасьць крэдытаў на куплю коняй пагражае сарваць сяўбу ў частцы гаспадарак.

Крэдыты на вапнаваньне і машыны ў суме каля 10.000 руб. застаюцца нескарыстанымі ў той час, калі не хапае крэдытаў на насеньне. Калгасбанк забараніў скарыстаць гэтыя 10.000 руб. на куплю насеньня.

5.000 руб., вызначаныя на птушніцтва, пяжаць у акрмалжывсаюзе, які ня цікавіцца іх скарыстаньнем. Будаўніцтва і загатоўка птушкі пакуль што толькі на паперы.

ВАЛАХНОВІЧ.

Аб дадатковых ільготах калгасам

Пастанова ЦВК і СНК БССР

Для аказаньня дапамогі калгасам у выкананьні імі веснавой сяўбы, ЦВК і СНК БССР пастанаўляюць:

Запрапанаваць Наркамфіну тэрмінова даць паказаньні акруговым фінорганам аб зьмяншэньні сельска-гаспадарчага падатку на калгасных фруктовых садох, махорцы, каноплях і ільне, скараціўшы нормы іх прыбытковасьці на 30 проц. супроць устаноўленага для дапага раёну.

Калгасам, якія перавыканалі плян засеву ільну і канопель, забясьпечыць аванс на кантрактацыю з кожнага гэктару засеянага звыш пляну ў падвойным разьмеры.

Запрапанаваць Белпаляводсаюзу разам з беларускай канторай Саюзкалгасбанку забясьпечыць у парадку пазыкі выдачу насеньня ільну і канопель у разьмеры поўнага запатрабаваньня для калгасаў з абавязковым зваротам яго пасьля збору ўраджаю.

Запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Гандлю БССР пры продажу калгасамі насеньня ільну і канапель забясьпечыць выдачу масла ў разьмеры ня менш 4 кілёграмаў і жмыхоў 8 кілёграм, а індывідуальным гаспадаркам ня менш 3 клгр. масла і 6 кгр. жмыхоў за кожны праданы цэнтнар насеньня, устанавіўшы разам з Белкалгасцэнтрам парадак выдачы масла.

Вызваліць на 1930-31 год членаў калгасаў ад самаабкладаньня, устаноўленага закападаўствам СССР і БССР.

Паказаныя вышэй ільготы пашырыць на камуны, арцелі і тыя т-вы па супольнай апрацоўцы зямлі, у якіх абагулены рабочая жывёла і інвэптар.

Народнаму Камісарыяту Зямляробства БССР і Белкалгасцэнтру прыняць меры да шырокага растлумачэньня гэтае пастановы, а таксама прасачыць за поўнай рэалізацыяй яе.

Старшыня ЦВК БССР А. ЧАРВЯКОЎ.
Старшыня СНК БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Сакратар ЦВК БССР А. ХАЦКЕВІЧ.

Сацспаборніцтва на паперы

Яшэ ў лютым Мар'іна-Горскі садова-гародны тэхнікум і Барысаўскі с.-г. тэхнікум парашылі ўступіць у сацспаборніцтва на лепшае правядзеньне насеўнай кампаніі і павялічэньне пасеўнай плошчы. З таго часу ўмова марыпусецца ў прафкоме і адміністрацыі Мар'іна-Горскага тэхнікуму. Дагавор не заключан.

Ю. П.

БССР сваячасова ня выканала пляну адгрузкі бульбы

Учора ў Наркамгандлі адбылася нарада па пытаньні аб адгрузцы бульбы з БССР. Выявіліся агіднейшыя і безадказныя адносіны нашых загатоўцаў да гэтага важнейшага пытаньня.

З 26.000 тон, якія павінны быць адгружаны да 10-га мая, на сёнешні дзень адгружана ўсяго 6.700 тон. Загатоўчыя арганізацыі ня ўжылі ніякіх мер да ўзмацненьня адгрузак. Яны тлумачаць дрэнны ход загатовак... адсутнасьцю ліпкаў бульбы ў БССР, што, як вядома, зусім не адпавядае сапраўднасьці.

Прадстаўнік Белпаляводсаюзу т. Баршай на нарадзе намаляваў зусім нездавальняючы малюнак ходу адгрузак бульбы па сыстэме Паляводсаюзу. З заяўкі ў 13.500 тон, якую атрымала сыстэма паляводсаюзу, на сёнешні дзень выканана толькі 2.700 тон. Паводле думкі т. Баршая, ні адна акруга ня можа выканаць даных ёй заданьняў па адгрузцы бульбы.

Крыху лепш стаіць справа з адгрузкай па лініі Белкаапсаюзу. На сёнешні дзень ён адгрузіў ужо да 6.000 тон бульбы.

Прадстаўнікі месц і работнікі «Плодагароднінны» тлумачаць слабы тэмп адгрузкі бульбы нездавальняючай работай загатоўцаў. Прадстаўнік «Плодагароднінны» падаў рад наступных фактаў. У Віцебскай, Менскай і Магілеўскай акругах, дзе, па думцы загатоўцаў, няма лішкаў бульбы, сяляне просяць, каб у іх куплялі бульбу па 40 кап. за пуд, г. зн. на 8 кап. ніжэй загатоўчай цаны. Паляводсаюз нічога ня робіць для ўзмацненьня загатовак бульбы. Да гэтага часу Віцебскі акрпаляводсаюз не атрымаў вестак аб тым, куды ён павінен адгружаць лішкі бульбы.

На ст. Чырвоны Бераг ужо 8 дзён ляжыць 1.900 тон бульбы. Паляводсаюз да 2-га мая ніяк ня мог наладзіць яе адгрузкі. Вагоны падаваліся на першым патрабаваньні.

Трэба адзначыць, што загатоўкі бульбы зусім не рэгулююцца. З 8.700 тон бульбы, якія на сёнешні дзень вывезены, 8.000 тон адгружаны выключна з Бабруйскае акругі. Загатоўкі бульбы вядуцца ў аспоўным выключна ў тых-жа раёнах, дзе праводзілася загатоўка і ўвосень. Аддаленыя пункты зусім не ахоплены. За Вуздой у адным сельскім каапэратыве загатоўлена 7.000 пуд. бульбы. Між тым ніякіх нарадаў, куды адпраўляць—каапэратыў не атрымлівае.

Да гэтага часу яшчэ ня зьнішчаны месьніцкія адносіны з боку некаторых РВК, якія забараняюць вываз бульбы за межы сваіх раёнаў. У Віцебскай акрузе было 5 такіх выпадкаў.

Нарада прызнала ход адгрузкі бульбы зусім нездавальняючым і пастанавіла перараз мерка вадь нарады на загатоўку бульбы наміж Белкаапсаюзам і Белпаляводсаюзам, павялічыўшы заданьне Белкаапсаюзу да 15.000 тон. Работа Белпаляводсаюзу прызнана недапушчальна слабай.

Апошні тэрмін выкананьня пляну адгрузак бульбы Наркамгандлем прадоўжаны да 15-га мая.

Пад кіраўніцтвам Ленінскага ЦК пяцігодку выканаем у 4 гады

Тэлеграма канфэрэнцыі ўдарнікаў Нова-Барысава — ЦК КП(б)Б

Цэнтральным Камітэтам камуністычнай партыі бальшавікоў Беларусі атрымана тэлеграма ад канфэрэнцыі ўдарнікаў Нова-Барысава, у якой гаворыцца:

Трэцяя канфэрэнцыя ўдарнікаў ударнага заводу імя «Камінтэрн» рапартуе арганізатару і кіраўніку сацыялістычнага спаборніцтва па Беларусі.

Мы перавыканалі прамфінплян па вырабе піламатар'ялаў на 18 проц., фанэры на 5½ проц. Прадукцыйнасьць працы вышэй пляну на 10 проц.

Адзіным прарывам зьяўляецца недавыкананьне пляну па зьніжэньні сабекошту, але найбольш цяжкія месяцы засталіся ззаду. У другую палову году гэты прарыў будзе зьліквідаваны.

Пад кіраўніцтвам Ленінскага Цэнтральнага Камітэту заданьне будзе выканана. Пяцігодка будзе ажыцьцёўлена ў чатыры гады.

ПРЭЗЫДЫУМ.

Прывітаньне „Зьвязьдзе"

Цэнтральнаму органу КП(б)Б «Зьвязьдзе», найлепшаму браацьбіту з ухіламі ад генэральнай лініі партыі, калектыўнаму арганізатару мас—ад Спуцкай райпартканфэрэнцыі гарачае бальшавіцкае прывітаньне.

На працягу ўсяго пэрыяду сваёй работы «Зьвязда» пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б была непрымірымым барацьбітом за чыстату Ленінскай ідэалёгіі, за правільнае правядзеньне генэральнай лініі партыі на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва.

Падкрэсьліваючы вялікую ролю «Зьвязды» ў барацьбе з правым і «левым» апартунізмам, у барацьбе за высокія тэмпы індустрыялізацыі, за ажыцьцяўленьне Ленінскіх наказаў па сацыялістычнай перабудове вёскі,—канфэрэнцыя выказвае ўпэўненасьць, што «Зьвязда» і надалей, пад выпрабаваным кіраўніцтвам Ленінскага ЦК, будзе найлепшым арганізатарам партыйных, рабочых і бядняцка-серадняцкіх мас вакол асноўных задач партыі.

Няхай жыве «Зьвязда»!

ПРЭЗЫДЫУМ КАНФЭРЭНЦЫІ.

На барацьбу за прамфінплян

Яшчэ 2.000 тон!

Дабрушане, не забудзьце аб сваіх абавязках

На вашай фабрыцы шмат буйных недахопаў

Добруская фабрыка «Гэрой Працы» імкнецца ўсімі сіламі ліквідаваць прарывы і перавыканаць вытворчую праграму. Фабрыка, згодна ўзятых на сябе абавязкаў, павінна даць звыш пляну 2.000 тон паперы. Гэта патрабуе ўзмацненьня тэмпаў у рабоце усіх заводзкіх арганізацый, патрабуе больш выразнай работы ўсяго «трыкутніка».

Але на фабрыцы повыя тэмпы адчуваюцца вельмі слаба. Ёсьць на фабрыцы настрої, якія цягнуць фабрыку назад. Калі папяровая машына № 6, якая здолее выпусьціць па 200 мэтраў паперы ў мінуту, пачала выпускаць 90 мэтраў замест 50, знайшліся рабочыя, якія закрычалі — «затрымайце ход машыны, навошта гнацца за рэкорднай колькасьцю».

Ударнікі ўпарта змагаюцца з такімі настроямі адсталых рабочых. Прозвішчы такіх ударнікаў як т.т. Бухонка, Бенэдыкт і Снуўскі варты быць запісаны на чырвоную дошку. Яны рыхтуюць папяровую масу на ролах для 6-й машыны. Калі апошняя пачала выпускаць больш паперы, яны пачалі таксама выпускаць больш папяровай масы. Замест 14-ці скрынь папяровай масы яны пачалі падаваць па 18 скрынь. Яны першыя перайшлі працаваць з 2-х ролаў на 3.

Супроць іх выспамі адсталых рабочых загаварыла фабрычная газэта «Чырвоная Бракамоўка» (!?). У нумары ад 20 сакавіка газэта піша, што выпуск 18-ці скрынь зроблены за кошт пагаршаньня якасьці работы. І гэта ня гледзячы на тое, што тэхнічны пэрсанал і сетачнікі кажуць адваротнае, што якасьць папяровай масы палепшылася.

У адказ на цкаваньне ўдарнікі замест 18 скрынь далі 19 і абяцаюць павысіць выраб да 20 скрынь. Так павінен адказаць на абвінавачаньні адсталых рабочых кожны ўдарнік, адданы справе выкананьня пяцігодкі за чатыры гады. Толькі гэта адаб'е ахвоту ў такіх рабочых, як Таўкачоў, падрываць работу ўдарнікаў.

Зараз Таўкачоў адмаўляецца пайсьці ў адпачынак. Ён баіцца, што на бракамоўцы, дзе ён працуе, паставяць другога рабочага, а можа яшчэ ўдарніка, які прымусіць яго лепую машыну пачаць працаваць паўдарнаму. Ён усё шукае, хто-б яго замяніў з «сваіх» людзей, які яго не падвядзе, не павялічыць яго нормы.

Гэтыя шкодныя настрої і справы не заўсёды знаходзяць належны адпор з боку «трыкутніка», у прыватнасьці прафарганізацыі. Наадварот, ёсьць факты, калі прафработнікі патураюць нядбайным адносінам да работы. Напрыклад, 18 красавіка на пасяджэньні РКК абгаворвалася заява прыбіральшчыц аб пераводзе іх з першага разраду ў другі. Старшыня цэхавага прафбюро быў затое, каб перавесьці іх у другі разрад, прычым высунуў такую матывоўку: «Праўда, вэтыя прыбіральшчыцы, з прычыны нядбайных адносін да ўборкі цэхаў, разам з абрэзкамі паперы кінулі ў машыны балты і кавалкі жалеза. Праўда, машына была паламана і яшчэ да гэтага часу стаіць у рамонце. Але я лічу, што ім трэба даць другі разрад і запісаць (!), каб яны ў далейшым гэтага не рабілі».

Так прафработнікі змагаюцца з нядбайнымі адносінамі да работы. Вынікі такой хвасьцісцкай прафработы даюць сябе адчуваць. П'янства на фабрыцы набывае пагражаючыя разьмеры. Асабліва п'янствуюць машыністы Шэўчанка, Скавародка, Міхалькоў. Машыністы Скавародка разьбіў два вагоны ў п'яным выглядзе. Яго аштрафавалі на 40 рублёў, а рамонт вагонаў будзе каштаваць каля 3.000 рублёў. Машыністы Міхалькоў дашчэнту разьбіў 2 вугольныя ваганэткі. Такіх фактаў шмат, а прафарганізацыя не вядзе з п'янствам рашучай барацьбы.

П'яныя рабочыя дапускаюцца да работы або атрымліваюць спраўкі ад цэхавай адміністрацыі ў амбулаторыю.

Наглядаюцца выпадкі рвацтва. Так, рабочыя фабрыкі Ўласенка, Лісоўскі і Закалінскі (першыя два камуністыя), якія былі накіраваны фабрыкай на вучобу і вярнуліся чырвонымі спэцамі, высунулі патрабаваньне, каб ім далі такую-ж пэнсію, як і старым спэцам, ім растлумачылі, што са старымі спэцамі заключаны індывідуальныя дагаворы і што яны атрымліваюць усяго на 40 руб. больш. «Мы з гэтым ня згодны» — заявілі «чырвоныя» спэцы, — «а калі вы не павялічыце нам пэнсіі, мы паедзем». І так ставяць пытаньне ўчарайшыя рабочыя фабрыкі, якія вучыліся за савецкія грошы.

Пры такіх адносінах да задач, якія стаяць перад фабрыкай, пры такіх адносінах кіраўнікоў да ўсіх буйных недахопаў у рабоце фабрыкі — цяжка будзе рабочым выканаць свае абавязацельствы. «Трыкутнік» павінен таксама перайсьці на новыя тэмпы работы — у адпаведнасьці з тэмпамі, якія трэба развіць для перавыкананьня прамфінпляну.

Б. ЗЭЛЬМАНАЎ.

Ці выйдзе фабрыка з дэфіцыту?

Ільна-прадзільная фабрыка імя Карла Маркса ў Высачанах, Віцебскай акругі, апошнія некалькі год зьяўляецца дэфіцытнай. За адзін толькі мінулы год фабрыка прынесла 10.000 руб. дэфіцыту. Адпаведныя органы прымушаны былі зьняць з работы дырэктара фабрыкі Прудніка, а таксама распусьцілі бюро парткалектыву і фабком. Пасьля гэтага фабрыка пачала працаваць некалькі лепш. Ужо наглядаецца некаторы зрух і ёсьць падставы меркаваць, што фабрыка ў гэтым годзе выйдзе з дэфіцыту.

Але на фабрыцы ёсьць яшчэ такія недахопы, якія трэба тэрмінова зьнішчыць.

Вытворчая нарада зьбіраецца толькі адзін раз у паўгода. Рабочае выпаходніцтва разгортваецца добра, але адміністрацыя не зварачае на гэта ўвагі. Напрыклад, за ўдасканаленьне лёкамабільных печаў сьлясар тав. Катэнка атрымаў 10 руб. прэміі і то пасьля бурнага канфлікту. За ўстаноўку нямецкага сушыльнага апарату, што патрабавала вялікай інтэнсыўнасьці работы, сьлясар Ярмалаеў нічога не атрымаў, хаця яму і абяцалі. Многа каштоўных прапаноў рабочых зусім не ажыцьцяўляюцца. Гэта ўжо прыпамінае работу старога фабкому, за час працы якога з 83-х прапаноў было праведзена ў жыцьцё толькі 13.

Ударніцтва, як і раней, носіць выпадковы характар. Ударныя брыгады ў большасьці выпадкаў знаходзяцца на паперы, а ўдарных тэмпаў у рабоце няма. Ударным рухам ніхто ня кіруе, прапановы ўдарных брыгад у жыцьцё не праводзяцца.

Зноў пачалі павялічвацца прастоі на віне адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу. Папсаваныя варштаты рамантуюцца са спазьненьнем.

На пытаньні аховы працы ніхто не зварачае ўвагі. Павялічваюцца выпадкі нявыхаду на работу на хваробе.

Мала кваліфікаванай рабочай сілы, а для падрыхтоўкі яе меры ня ўжываюцца.

Неабходна зараз-жа зрабіць рашучы пералом ва ўсёй рабоце фабрыкі, падтрымаць ініцыятыву рабочай масы, чула адносіцца да яе прапаноў, ажыцьціць вытворчыя нарады, падтрымаць вынаходніцтва, палепшыць кіраўніцтва ўдарнымі брыгадамі, больш рашуча рэагаваць на ўсе вытворчыя недахопы. Толькі такімі мэтадамі можна гарантаваць ліквідацыю прарыву і выхад з дэфіцыту.

Н. СЛОБІН

Палепшыць работу біржы піламатар'ялаў

Біржа піламатар'ялаў—адно з слабых месц Бабруйскага камбінату. Дзьве штабельныя машыны з мінулай восені стаяць бяз руху. Адна з іх за ўвесь час працавала толькі адзін месяц. Каштоўныя замежныя машыны стаяць адкрытымі пад дажджом і ў адной з іх ужо не хапае шасьцёркі. Брэзэнты, якімі былі накрыты машыны, пакрадзены.

Плянаваньне складу рабілася ў працэсе самой работы і дасюль ня скончана.

Склад поўнасьцю загружаны матар'ялямі. Калі лесацэх пачне працаваць на з зьмены, склад ня зможа прыняць усю прадукцыю, што можа стварыць пагрозу для нармальнай работы цэху.

Свайго пляну біржа піламатар'ялаў ня мае. Няма нават норм выпрацоўкі рабочага ў дзень. «Робіць колькі магчыма»—растлумачылі нам.

Уліку сацспаборніцтва на біржы няма, хоць прафпоўнаважаны і гаворыць, што сацспаборніцтва паміж паасобнымі групамі рабочых наладжана.

Кошт укладкі дошак перавышае плянавыя меркаваньні. Укладка куб. мэтра дошак павінна каштаваць 27,13 кап. а фактычна абыходзіцца ў 30,91 кап.

Нармальнай рабоце біржы перашкаджае цеснота сартавачнага лесацэху, з гэтае прычыны шмат матар'яду прыходзіцца сартаваць два разы (у лесацэху і на біржы).

Трэба адзначыць яшчэ адну ненармальнасьць. На камбінаце працуюць 6 бракераў, якія могуць справіцца са сваёй работаю. Але чамусьці на камбінаце сядзяць спэцыяльныя прыёмшчыкі Дзяржшвэймапыны, Дрэвтрэсту і Экспартлесу, без якіх можна было-б лёгка абыйсьціся.

Арганізацыям камбінату трэба глыбей зацікавіцца працаю біржы піламатар'ялаў.

Брыгадзіры «Зьвязды»
А. МАГІДАЎ, ФАЛЬКО, ГАЛОЎКІН.
Брыгадзір ЦСПСБ ГОЛЬДБЭРГ.
Члены ЧКК—МАКС і КАРАТКЕВІЧ.

Чым далей, тым горш

Пытаньне аб самаправерцы па Мазырскай фабрыцы «Чырвоны Кастрычнік» зацікавіла ўсю рабочую масу. У праверцы прымала ўдзел 69 добраахвотнікаў. Актыўнасьць рабочых была настолькі вялікая, што многія тут-жа запісваліся ва ўдарныя брыгады. Зараз 54 проц. рабочых фабрыкі зьяўляюцца ўдарнікамі.

Але фабрычныя арганізацыі ня здолелі арганізаваць актыўнасьць рабочых. За ўвесь час ніякага кіраўніцтва ўдарнымі брыгадамі ня было. Сярод ударнікаў былі і такія, што думалі толькі аб сваёй кішэні. Ударным брыгадам не далі канкрэтных заданьняў.

Усё гэта прывяло да зрыву прамфінпляну ў першым квартале і яшчэ большага прарыву ў другім квартале. Калі ў першым квартале вытворчая праграма недавыканана на 3,18 проц., а па экспарце на 11 проц, дык у другім квартале вытворчая праграма недавыканана на 9,95 проц., а па экспарце на 5 проц. Калі перавыдатак сырцу ў першым квартале складаў 6,93 проц., дык у другім квартале—10 проц.

Прадукцыйнасьць працы ніжэй лічбы, вызначанай плянам, на 13,87 проц. Брак складае вялізарную лічбу—49 проц. (!?).

Прамфінплян да гэтага часу яшчэ не даведзены нават да цэху. Рабочыя зусім ня ведаюць аб сваім прамфінпляне. Фонд прэміяваньня—пескарыстаны. Нават лепшыя ўдарнікі ні разу не прэміяваліся.

М. ВАПЕЛЬНІК.

Міма баявых задач дня

Абсьледваньне культмасавай работы на прадпрыемствах Мазырскай акругі паказала, што гэтая работа зусім не прыстасавана да баявых задач сёнешняга дня (выкананьне прамфінпляну, сацспаборніцтва, пасеўкампаніі і інш.).

Культмасавая работа фактычна не прыстасавана да бесперапыннага рабочага тыдня. Напрыклад, на зав. «Зьвязда», у Жыткавічах, і часткова ў Петрыкаве, калі прызначаецца якое-небудзь масавае мерапрыемства, дык стараюцца зрабіць яго ў суботу ці ў нядзелю.

Галоўным-жа недахопам культмасавай работы зьяўляецца яе адарванасьць ад вытворчасьці.

У палітыка-выхаваўчай рабоце зусім не выкарыстоўваюцца радыё-ўстаноўкі. Ні адна радыё-ўстаноўка ня мае сталых праграм, няма арганізаванага радыёслуханьня. Зусім не радыёфікаваны рабочыя пасёлкі заводаў «Чырвоны Кастрычнік» і «Пралетары». Гэтыя пасёлкі знаходзяцца ад гораду за 3-6 кілёмэтраў і ніякай культасьветнай работы там не вядзецца.

У большасьці праца бібліятэк зводзіцца да механічнага абмену кніжак. Бібліятэкі зусім слаба папулярызуюць ідэю сацспаборніцтва і ўдарніцтва. У многіх бібліятэках нават няма літаратуры пра сац. спаборніцтва і ўдарныя брыгады.

Партыйныя арганізацыі слаба кіруюць прафэсыянальнымі арганізацыямі.

Надзвычайна дрэнна наведваюцца на прадпрыемствах агульныя сходы. На чыгунцы з 3.500 чал. наведваюць сходы 250; на зав. «Чырвоны Кастрычнік» з 2-х зьмен — 300-350 чал. наведвае сходы 100 чал.; на зав. «Пралетары» з 170—наведвае 75 чал. і на зав. «Зьвязда» з 350-400 чалавек — 150 чалавек. Ніякай падрыхтоўкі да агульных сходаў з боку парт'ячэек і фабкомаў не вядзецца. Большасьць прадпрыемстваў працуе ў дзьве-тры зьмены, але-ж культмасавая работа ня прыстасоўваецца да зьменнай работы, да работы ў цэху.

Ш.

Друк, як арганізатар мас

5-га мая (22 красавіка) 1912 году, вядомая веха ў гісторыі рабочага руху. На сабраныя самымі рабочымі сродкі была арганізавана «Правда».

Да дзесяцігадовага юбілею «Правды» 5 мая, у 1922 годзе Ленін пісаў: «Калі засноўвалася старая «Искра», у 1900 годзе, у гэтым удзельнічаў які-небудзь дзесятак рэвалюцыянэраў. Калі ўзьнікаў бальшавізм, у гэтым удзельнічала на нелегальных зьездах Брусэлю і Лёндану ў 1903 годзе дзесяткаў чатыры рэвалюцыянэраў.

У 1912-13 г.г., калі ўзьнікла легальная бальшавіцкая «Правда», за ёю стаялі **дзесяткі і сотні тысяч рабочых**, якія сваімі капеечнымі зборамі перамагалі і ўціск царызму, і канкурэнцыю дробнабуржуазных здраднікаў сацыялізму — меншавікоў»..., «а ў змаганьні бальшавікоў была ў канцы кастрычніка і ў лістападзе 1917 г. **большасьць** пралетарыяту і сьвядомага сялянства.

Праз «Правду» партыя, сама знаходзячыся ў падпольлі, наладжвала сувязь з шырокімі пластамі рэвалюцыйных рабочых. «Правда» з першых дзён свайго існаваньня зрабілася службовым органам партыі, арганізатарам—у цяжкіх умовах царызму — рабочых мас вакол няўрэзаных лёзунгаў бальшавізму. Нават такая «нявінная» з першага погляду справа, як збор сродкаў у жалезны фонд «Правды», па сутнасьці была важнейшай партыйнай справай, на аснове якое арганізавалася не адна партыйная група рабочых і за што не адна сотня рэвалюцыйных рабочых трапіла ў турмы і ссылку. Праз «Правду» рабочыя шчыльна падыходзілі да партыі.

У працягу больш двух год, з неаднаразовымі перапынкамі, выкліканымі жандарскімі рэпрэсіямі, «Правда» пад рознымі назвамі («Рабочая Правда», Северная Правда», «За правду», «Путь правды» і г. д.), кіраваная Леніным з-за мяжы, рабіла сваю вялікую справу — агітавала і прапагандавала ідэі бальшавізму і арганізоўвала шырокія рабочыя масы вакол партыі.

Праз два гады пасьля заражэньня «Правды» (5 мая (22 красавіка) 1914 году), піцерскія рабочыя арганізавалі **першы дзень рабочага друку** для збору сродкаў і прапаганду ідэй «Правды» сярод шырокіх мас рабочых. З «маленькіх лічбаў», зборaў па «Правду», Ленін рабіў вялікія вывады аб тым, за кім—за бальшавікамі ці меншавікамі—ідуць рабочыя масы.

Дзень рабочага друку, ня гледзячы на ўсе намаганьні ахранкі і жандармэрыі, разгарнуўся ў шырокую, масавую і працяжную кампанію за бальшавіцкую легальную прэсу, за далейшае скарыстаньне яе ў якасьці прывадного пасу для сувязі падпольнай бальшавіцкай партыі з рабочымі масамі.

Сусьветная імпэрыялістычная бойня на час перарвала існаваньне **штодзённай** бальшавіцкай легальнай прэсы. Царская жандармэрыя задушыла «Правду» і арыштавала работнікаў партыі.

Пасьля першых-жа дзён лютаўскай рэвалюцыі зноў адраджаецца «Правда» ўжо адкрыта, як орган Цэнтральнага Камітэту партыі бальшавікоў. Праз «Правду» на ўсю Расію грымеў рэвалюцыйны заклік Леніна да рабочых. **«Уся ўлада саветам».** «Правда» зрабілася баявым і арганізуючым цэнтрам нарастаючай пралетарскай рэвалюцыі.

Часовы ўрад праз юнкераў дарэмна прабаваў задушыць бальшавіцкі друк. Нават разгром 18 (5) ліпеня 1917 г. друкарні «Правда» не дапамог буржуазіі ўмацаваць свае пазыцыі ў змаганьні супроць бальшавізму.

Зноў, як і за царызмам, пад рознымі назвамі («Листок Правды», «Рабочий и Солдат», «Рабочий Путь» і інш.) цэнтральны орган партыі, побач з іншым бальшавіцкім друкам у Маскве і на франтох, працягваў, пад непасрэдным кіраўніцтвам Леніна, выконваць сваю гістарычную справу — арганізацыю і падрыхтоўку мас да захвату ўлады і ўстанаўленьня пралетарскай дыктатуры.

Наступіўшыя сьледам за тым цяжкія гады грамадзянскай вайны былі гадамі выключнага гэраізму і напружанай работы для нашага друку. Ён дапамагаў партыі, ва ўмовах разрухі, арганізаваць перамогу на франтох грамадзянскай вайны.

У далейшым — у змаганьні за транспарт, за вугаль, нафту і руду пралетарская рэвалюцыя, праз адбудоўчы пэрыяд нашае народнае гаспадаркі, падышла шчыльна да рэканструкцыйнага пэрыяду, да разгорнутага будаўніцтва сацыялізму.

Задачы друку значна ўскладніліся. Нашы газэты павінны былі перабудавацца ў органы вытворчага выхаваньня, у прыладу сацыялістычнага будаўніцтва. Яшчэ Ленін з усёй яму ўласьцівай выразнасьцю і яснасьцю вызначыў гэты шлях разьвіцьця партыйнага савецкага друку. У сваім артыкуле «Коммунистическая печать в переходном периоде» ён піша:

«Менш палітычнай траскатні, менш агульных разважаньняў і абстрактных лёзунгаў, якімі захапляюцца неспрактыкаваныя і незразумеўшыя сваіх задач камуністы, — больш вытворчай прапаганды, а больш за ўсё дзеławога, умелага прыстасаваньня да ўзроўню разьвіцьця масы, уліку практычнага вопыту» (Ленін, т. XVIII, ч. I, стар. 78).

Гіганцкі размах капітальнага будаўніцтва ў нашай прамысловасьці, задачы сацыялістычнай перабудовы сельскае гаспадаркі ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы, мабілізацыя і арганізацыя мас вакол чарговых задач партыі і рабочае клясы, у змаганьні за прамфінпляны, за разгорнутае калгаснае будаўніцтва, мяркуе выключнае напружаньне ўсіх сіл партыйных, прафэсыянальных, камсамольскіх і гаспадарчых арганізацый, **у тым ліку ўсяго нашага друку.** Выкананьне пяцігодкі, як папярэдняя ўмова ажыцьцяўленьня лёзунгу партыі «дагнаць і перагнаць у тэхнічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны», у сваю чаргу патрабуюць карэннай перабудовы радоў і мэтадаў работы партыйна-савецкага друку, які абавязан усвоіць і ператварыць у сваёй рабоце тыя паскораныя тэмпы, якімі зараз жыве і працуе ўвесь савецкі край.

За апошні год значна выраўнялася лінія нашых газэт. Значна блі

1-га МАЯ У БССР

Рабочыя Менску сьвяткавалі 1-га мая пад знакам поўнага і безагаворачнага адабрэньня генэральнай лініі партыі і яе Ленінскага Цэнтральнага Камітэту

Працоўныя БССР прадэманстравалі сваю поўную гатоўнасьць пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі зьнішчыць усе перашкоды, перамагчы ўсе цяжкасьці на шляху да сацыялізму

1) Піянэры на парадзе, 2) Чырвоная армія на парадзе, 3) Тав. Ягораў чытае тэкст прысягі, 4) Чырвоная армія прымаў прысягу, 5) Чырвоны фронт Нямеччыны, 6) Вольтэр Юрых, 7) Рудольф Наўман.

На дэманстрацыі

А 9-й гадзіне раніцы стройнымі калёнамі па пляц Парыскай Камуны рушыліся байцы менскага гарнізону. Чырвоная армія дэманстравала сваю магутнасьць і гатоўнасьць да абароны Кастрычніцкай рэвалюцыі і аб гэтым яна сёньня ўрачыста прысягала.

— «Мы, сыны працоўнага народу перад тварам сваіх таварышоў заяўляем, што кожную хвіліну мы гатовы стаць на абарону межаў краіны савецкіх сацыялістычных рэспублік ад цёмнай зграі сусьветнага імпэрыялізму. Мы вайны ня хочам, але, калі на нас уздумаюць напасьці і прымусяць нас узяцца за зброю, мы возьмемся, будзем змагацца і пераможам...»

У гэты-ж час тысячныя калёны пралетараў з усіх вуліц Менску сыходзіліся на пляц Волі, дзе выстрайваліся шпалерамі. Пляц быў пакрыты шматтысячнай масай людзей, над якой нібы мора паласкаліся чырвоныя сьцягі, лёзунгі і плякаты.

— «Выканаем і перавыканаем прамфінплян». «На імкненьне буржуазнага сьвету напасьці на Савецкі Саюз, адкажам выканальнем пяцігодкі ў чатыры гады». «Няхай жыве 1-е мая—агляд сілы сусьветнага пралетарыяту».

— Вось галоўным чынам аб чым гаварылі плякаты і лёзунгі.

На гарадзкім гадзіньніку адбіла роўна 12. На трыбуну падымаюцца прадстаўнікі партыі, ураду і вайсковага камандваньня. **Т. т. ВАСІЛЕВІЧ, ГАЛАДЗЕД, ЯГОРАЎ, ПАЛЯКОЎ, СЯНЬКЕВІЧ, СЛАВІНСКІ І АКСЮЧЫЦ, прадстаўнікі саюзу чырвоных франтавікоў Нямеччыны, дэлегацыі прафсаюзаў.**

Непарыўным патокам праходзілі міма трыбуны часьці чырвонай армії, рабочыя, фізкультурнікі і піянэры. Гучным ура адказвалі яны на першамайскае прывітаньне.

Сьвята 1-га мая — бадзёрае і жыцьцёрадаснае. Гэта моцна падкрэсьліваў вясёлы карнавал, які дасьціпна зьдзекваўся над папай рымскім—аўтарам няўдалага крыжовага паходу і шмат іншых момантаў.

1-е мая ў клюбах

Клюб друкароў. 30-га красавіка, 1-га і 2-га мая адбываліся вечары для рабочых менскіх друкарань. На ўрачыстых сходах друкароў абгаворвалася праца паасобных друкарань, а таксама кожнага цэху. Пераплётны цэх 1-й друкарні і машынны — 2-й друкарні атрымалі пераходныя сьцягі, лепшыя ўдарнікі атрымалі каштоўныя прызы.

Для дзяцей членаў саюзу друкароў было наладжана некалькі ранічнікаў. Сіняя блюза клюбу друкароў выяжджала ў падшэфны Халопеніцкі раён, у м. Халопенічах, яны арганізавалі вялікі карнавал.

2-га мая рабочыя друкары наладзілі сумесна с падшэфнай вайсковай часьцю маёўку за горад, дзе адбыліся стралковыя спаборніцтвы і фізкультурныя гульні.

Клюб Саўгандальслужачых.

Напярэдадні 1-га мая ў клюбе адбыўся вялікі вечар, на якім прысутнічала звыш 2.000 чалавек. На гэтым вечары таксама прысутнічалі прадстаўнікі падшэфных саюзу саўгандальслужачых калгасаў, якія азнаёмілі ўдзельнікаў вечару з жыцьцём і працаю калгасаў.

2-га мая адбыўся выхад за горад разам з падшэфнымі чырвонаармейскімі часьцямі. Вечарам быў даны вялікі канцэрт для членаў саюзу сельгаслесарабочых. і іх сямей. У клюбе быў адкрыты куток сацспаборніцтва

Клюб Мэталістых.

Пры клюбе была адкрыта выстаўка

1-ае мая ў Бабруйску

Адкрыцьцё швэйнай фабрыкі

(Ад нашага карэспандэнта)

Яшчэ напярэдадні горад быў упрыгожан шматлікімі лёзунгамі, плякатамі, сьцягамі і сьветлавымі эфэктамі.

Вечары 30-га красавіка па ўсіх клюбах адбыліся ўрачыстыя сходы. Ня гледзячы на дрэннае надвор'е, адбыўся таксама і факельны паход.

Раніцой 1-га мая адбыліся вялізарнейшыя дэманстрацыі працоўных. У першай калёне дэманстрантаў—**прадпрыемствы, выканаўшыя і перавыканаўшыя прамфінплян: фанэрны завод імя Томскага, шчацінная фабрыка, рабочком будаўнікоў камбінату, камбінат і друкарня.**

На плошчы адбыўся парад. Чырвоныя байцы далі «чырвоную прысягу».

Увечары 1-га мая на клюбах адбыліся вытворчыя вечары з падагуленьнем выканаў сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Там-жа былі разданы прэміі лепшым ударнікам.

Рабочыя швэйнай фабрыкі ў адказ на ўсе прывітаньні ўрачыста абяцалі разгарнуць ударныя тэмпы працы, выканаць і перавыканаць прамфінплян, папоўніць партыю лепшымі сваімі прадстаўнікамі.

2-га мая адкрыўся трансьляцыйны радыё - вузел, па клюбах адбыліся дзіцячыя ранішнікі і дэманстрацыя фізкультурнікаў.

А. М.

На ўрачыстым пленуме гарсавету

Тысячы працоўных прышлі 30-га красавіка ў Дом Культуры на ўрачысты пленум Менскага гарсавету, разам з прадстаўнікамі партыйных, савецкіх, прафэсыянальных арганізацый і Чырвонай армії.

Пленум адкрыў старшыня гарсавету тав. Аксючыц.

Ва ўступным слове тав. **Аксючыц** падрабязна спыніўся на падзеях апошніх дзён — замаху на выбух савецкага паўпрэдстава ў Варшаве.

— Варшаўскі замах гаворыць аб тым, што васная небясьпека для нас з кожным днём узрастае. Працоўныя СССР і асабліва БССР павінны гэта памятаць.

Пленум ушанаваў уставаньнем памяць барацьбітоў, загінуўшых за справу пралетарскай рэвалюцыі.

Старшыня ЦВК БССР тав. **Чарвякоў** выступіў з двухгадзінным дакладам аб 1-м маі

Дакладчык даў падрабязны аналіз міжнароднага і ўнутранога становішча СССР.

Гучнымі воплескамі было спаткана зьяўленьне на трыбуне дэлегатаў харкаўскага пралетарыяту і кіеўскай рабочай моладзі, якія прыехалі ў Менск на першамайскія ўрачыстасьці па запрашэньні ЦСПСБ і камсамольскіх арганізацый.

Тав. **Він**, член харкаўскай дэлегацыі (працуе на буйной швэйнай фабрыцы імя **Ценякова**) расказвае пленуму:

— Мы наведалі рад буйных прамысловых прадпрыемстваў Менску, гутарылі з рабочымі і ўпэўніліся, што рабочыя БССР разам з пралетарыятам усяго Савецкага Саюзу будуюць сацыялізм.

Тав. **Жалецкі** вітаў пленум ад імя кіеўскіх камсамольцаў і рабочай моладзі.

Чырвонаармеец Харкаўскага гарнізону тав. Ішчук гаворыць:

— Зараз, як ніколі, буржуазія ўсіх колераў, пачынаючы ад караля царквы папы рымскага і канчаючы сацыял-дэмакратамі, рыхтуецца да вайны супроць Савецкага Саюзу.

— Перад тварам высокай адказнасьці, ускладзенай на Чырвоную армію, будзем кожны дзень і кожную гадзіну ўзмацняць нашу магутнасьць.

— Мы запэўняем, — сказаў т. Ішчук, —партыю і рабочую клясу, што абарона СССР знаходзіцца ў верных руках.

Рабочыя менскіх фабрык і заводаў рапартавалі аб сваіх дасягненьнях на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

Першай гаворыць **работніца** швэйнай фабрыкі **«Кастрычнік»** т. **Палеес.**

Усе 100 проц. рабочых фабрыкі «Кастрычнік», — кажа тав. Палеес, — абвязсьцілі сябе ўдарнымі. 200 лепшых рабочых падалі заявы аб уступленьні ў партыю.

У 1928-29 годзе на «Кастрычніку» працавала 884 рабочых, было выпушчана 249.000 шт. гатовага адзеньня на 10 млн. рублёў. Цяпер на фабрыцы рабочых 1.420 чал. і прадукцыі сёлета будзе выпушчана на 17 млн. руб.

За першае паўгодзьдзе прамфінплян выкананы на **103,27 проц.**, у красавіку — **на 113 проц.** Сабекошт прадукцыі зьніжан у першым квартале **на 8 проц**, пачынаючы са студзеня — **на 12 проц.**

Гаворыць рабочы заводу **«Камунар»** тав. **Платонаў.**

— Завод «Камунар» выканаў свой прамфінплян **на 104 проц.** На выканаўчы прамфінплян і зьніжэньні сабекошту «Камунар» ідзе па другім месцы ў БССР.

— Рабочыя «Камунара» запэўняюць, што яны і ў далейшым будуць змагацца за перавыкананьне прамфінпляну, за ажыцьцяўленьне пяцігодкі за 4 гады.

Тав. **Кошкін** перадае пленуму прывітаньне ад 700 рабочых вагонных майстэрань Менскага вузла.

— Вагоныя майстэрні пераходзяць зараз на выпуск абсталяваньня для фабрык - кухань. Гэтым самым сотні тысяч жанчын будуць вызвалены ад кухні і змогуць быць уцягнуты ў актыўнае сацыялістычнае будаўніцтва.

М. КІН.

З рэзалюцыі пленуму гарадзкога савету

Пленум Менскага гарадзкога савету шле шчырае брацкае прывітальне рабочым і працоўным масам Заходняй Беларусі, якія пад сьцягам ленінізму рашуча змагаюцца за сваё вызваленьне ад уціску капіталізму.

Пленум Менскага гарадзкога савету адзначае, што дзякуючы правільнаму правядзеньню ў жыцьцё ленінскай нацыянальнай палітыкі, пры рашучай барацьбе з беларускім нацыянал-дэмакратызмам, як і ўсімі відамі нац. шавінізму Савецкая Беларусь, пад кіраўніцтвам КП(б)Б і пры дапамозе СССР, дасягнула вялікіх посьпехаў у рэканструкцыі сацыялістычнай прамысловасьці і ў культурным будаўніцтве, ператвараючыся з краіны аддсталай, аграрнай у край індустрыяльна-аграрны.

Прамысловасьць у гэтым годзе дае падвойныя разьмеры даваеннай прадукцыі. На падставе гэтых посьпехаў, у выніку ўзмацненьня саюзу рабочае клясы з асноўнымі масамі сялянства і кіруючай ролі пралетарыяту ў гэтым саюзе — пачаўся вялізарны рух бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у калгасы. Серадняк зрабіў паварот да сацыялізму, у выніку чаго ёсьць вялізарныя дасягненьні ў справе калектывізацыі. Партыя на грунце суцэльнае калектывізацыі перайшла ад абмежаваньня кулацтва да ліквідацыі яго, як клясы. Шпаркае, рашучае выпраўленьне дапушчаных у практычнай рабоце пры правядзеньні калектывізацыі памылак і перагібаў, якія супярэчаць палітыцы партыі па ўзмацненьні саюзу рабочае клясы з сераднякамі масамі сялянства, выкананьне пасеўных плянаў, перавод калгасаў па новы статут, сваячасовы адвод зямлі для калгасаў і індывідуальных гаспадарак пад яравы клін, правільная арганізацыя працы ў калгасах і прынцып добраахвотнасьці і бязупынная барацьба супроць кулацтва, да зьнішчэньня кулацтва, як клясы, на падставе суцэльнае калектывізацыі — усё гэта замацуе дасягнутыя посьпехі ў калектывізацыі дасьць новы бурны тэмп у калгасным руху і падрыхтуе пераход да вышэйшых форм калгаснага руху.

У дзень 1-га мая пленум Менскага гарадзкога савету заклікае пралетарыят гор. Менску да выкананьня прамфінпляну, да напружаньня сваіх сіл у выкананьні якасных і колькасных паказальнікаў пляну. Гарсавет заклікае рабочых пляніць масавы ўдзел у справе разгортваньня сацспаборніцтва ўдарных брыгад, які і паскорыць выкананьне прамфінпляну іперавыкананьне яго.

Пленум Менскага гарадзкога савету заклікае рабочых масы яшчэ шчыльней самкнуцца вакол партыі і яе Ленінскага ЦК і яшчэ больш узмацніць дзяржаву дыктатуры пралетарыяту для рашучай барацьбы за перамогу сацыялізму.

Першамайскія падарункі

У Воршы скончана пабудова бэконнага камбінату, які будзе штогодна працускаць 75.000 штук сьвіней. Кошт будаўніцтва каля 3 мін. руб.

Пачаў работу птушка-яйкавы камбінат Белдзяржгандлю, разьлічаны на 160.000 курэй і 60.000 гусей.

У Рабруйску пушчана ў ход вялікая швэйная ф-ка, у якой працуе 1000 чалавек.

— У Крычаве, Магілеўскай акругі, скончана будаўніцтва першага на Беларусі буйнога фасфарытавага заводу, разьлічанага на 42.000 тон фасфарытавае мукі ў год.

Менск у першамайскія дні

Яшчэ за некалькі дзён да 1-га мая горад і асабліва рабочыя ваколіцы ўзмоцнена рыхтаваліся да пралетарскага сьвята.

На прадпрыемствах у часе абедзенага перапынку, у чырвоных куткох праводзіліся гутаркі аб 1-м мая.

Рыхтаваліся спэцыяльныя нумары насьценных газэт. Заводы «Энэргія» і інш. выпусьцілі друкаваныя шматтыражкі, прысьвечаныя першамайскаму сьвяту.

Ужо 30-га красавіка горад набыў сьвяточны выгляд — будынкі былі прыбраны ў зеляніну, чырвоныя палотнішчы, ілюмінаваны.

На вуліцах — вялікае перадсьвяточнае ажыўленьне.

А 6-й гадзіне ўвечары мопраўцы наладзілі вялікі карнавал і «шествие каторжан» з мэтай папулярызацыі «чырвонай кветкі».

* * *

Ва ўсіх рабочых клюбах 30-га красавіка, 1-га і 2-га мая адбыліся масавыя ўрачыстыя вечары. У гэтых вечарох прымалі ўдзел шматлікія дэлегацыі калгаснікаў, сялян, чырвонаармейцаў, якія былі запрошаны на сьвята рабочымі арганізацыямі — шэфамі. У клюбе будаўнікоў на вечары прысутнічала 25 калгаснікаў з падшэфнага Астрашыцка - Гарадзецкага раёну.

З свайго боку фабрыкі і заводы накіравалі на першамайскае сьвята ўдзельнікі і калгасы дзесяткі рабочых дэлегацый.

* * *

У Менск на першамайскія ўрачыстасьці прыехалі дэлегацыі, харкаўскіх рабочых у складзе 9-ці чалавек, кіеўскіх камсамольцаў і рабочай моладзі з 10 чалавек. Дэлегацыі наведалі рад прадпрыемстваў і культустаноў горада і прымалі ўдзел ва ўрачыстым пленуме гарсавету.

У Харкаў на першамайскае сьвята выехала з Менску рабочая дэлегацыя 10 чалавек.

* * *

У сувязі з 1-м мая адбыліся выпускі лікпунктаў. Па саюзе будаўнікоў ліквпунктамі выпушчана каля 500 чалавек.

* * *

У першамайскія дні праведзены рабочых маёвак і экскурсій. На Асіповічы выехала група экскурсантаў з 300 чалавек. У Менск прыбылі з раёнаў экскурсіі вучняў.

* * *

Скарбоначны збор «чырвонай кветкі» арганізаваны МОПР'ам, даў за 30-е красавіка і 1-ае мая каля 5.000 руб.

* * *

Рабочыя вагонных майстэрань Менскага вузла ў адзнаку пралетарскага сьвята адрамантавалі звыш праграмы 1 паравоз і 5 таварных вагонаў.

Да новых тысяч ударнікаў - да новых посьпехаў у баявой вучобе

Скончыў сваю работу зьлёт ударнікаў БВА.

Перадавыя чырвонаармейцы - ўдарнікі тварам да твару стыкнуліся з перадавымі рабочымі - мэталістымі, з гігантам савецкай індустрыі. Энтузіясты баявой падрыхтоўкі дэманстравалі свае дасягненьні ў найбольш буйным рабочым цэнтры. Пралетары «Чырвонага Прафінтэрну» і дзесяткі іншых буйных заводаў прымалі ўдзел у гэтым агляде, узмацнялі сувязь з Чырвонай арміяй.

Зьлёт склікаўся ў адказьнейшы момант, напярэдадні пэрыяду летняй вучобы, у гадавіну сацыялістычнага спаборніцтва з тым, каб на падставе ўліку практыкі замацаваць посьпехі, ліквідаваць слабыя месцы і вызначыць наступны этап у справе разьвіцьця ўдарнага руху ў часьцях БВА.

Абагачаныя практыкай першага этапу ўжываньня ўдарніцтва ў баявой падрыхтоўцы, ударнікі на зьлёце, расказваючы пра свае посьпехі, гаварылі пэдахопах, аб хваравітасьцях ударнага руху і выявілі ўсе свае слабыя месцы.

На зьлёце падагулілі рост ударнага руху. Заклік Рэвваенсавету БВА — сувязі з 12-й гадавінай РСЧА даць часьцях акругі новых 10 тысяч ударнікаў — спаткаў дружны водгук і ў кароткі тэрмін часьці акругі далёка перавыканалі заклік РВС. Ад паасобных ударнікаў яны прышлі да ўдарных дзяленьняў, разьдзелаў, рот, эскадронаў і батарэй, ад іх — да ўдарных палкоў.

Да зьлёту ўдарнікаў у акрузе быў дзьве ўдарныя дывізіі. У дні гадавіны сацыялістычнага спаборніцтва і першамайскіх урачыстасьцяй іх будзе і калькі.

У часьцях акругі сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва абярнулася магутным вагар узмацненьня баявой падрыхтоўкі, яно адбівае сапраўдны энтузіязм чырвонаармейскіх мас, які загаўтаваў і чырвонаармейцаў, і начальніцкі склад вакол партыі і яе генэральнай лініі, што даказвае ўзмоцненая цягна партыю перадавой часткі чырвонаармейцаў і начальніцкага складу.

За другую палову красавіка месяца ў часьцях акругі падана звыш 1.500 заяў аб уступленьні ў партыю — вопытам гэтай цягі.

У сваёй рабоце зьлёт вырашыў цэлы рад канкрэтных задач. Асноўная задача — далейшае разьвіцьцё ўдарніцтва вакол канкрэтных пытаньняў баявой палітычнай вучобы ў летні, найбольш адказнейшы пэрыяд. Трэба дабіцца таго, каб у лягерах наш баец добра ўсвоіў найбольш важныя элемэнты баявой падрыхтоўкі і быў у поўнай меры закончаным байцом.

Другая задача — гэта зьшыць слабыя месцы ва ўдарніцтве, весьці барацьбу з ілжэ-ўдарніцтвам і выпадкамі аслаблення ўдарніцтва і сацыялістычнага спаборніцтва.

Зьлёт падрабязна спыняўся на пытаньнях паляпшэньня кіраўніцтва ўдарным рухам з боку партыйных арганізацый часьцей. Апошняя пастанова ЦК УсеКП(б) «Аб выніках ленінскага пакліку ўдарнікаў» патрабуе ад нашых арганізацый адзінай гібкасьці ў справе кіраўніцтва ўдарным рухам.

Наш плян баявой падрыхтоўкі часьцей таксама павінен быць даведзен да бойца, каб кожнае ўдарнае падразьдзяленьне ўзяло-б на сябе канкрэтнае абавязацельства ў справе павышэньня сваёй баявой і палітычнай падрыхтоўкі. Гэтым самым мы выканаем пастанову ЦК УсеКП(б).

Зьлёт ударнікаў БВА праверыў дасягнутае, вызначыў шляхі замацаваньня з тым, каб ударніцтва дало яшчэ большыя вынікі ў баявой падрыхтоўцы часьцей акругі.

Не дарма ў сваім першамайскім загадзе Рэвваенсавет акругі піша: «Новыя тысячы ўдарнікаў, новыя посьпехі ў баявой вывучцы, новыя кадры сацыялістычнага будаўніцтва вёскі і гораду — такі заклік кідае часьцям Рэвваенсавету акругі ў пралетарскае сьвята».

Зьлёт сваёй работай даказаў, што гэты заклік будзе выканаў.

Н. В

Ленін аб 1-м мая ў Расіі*)

4 (17) чэрвеня 1912 году тав. Ленін піша артыкул пад назвай: «Лёзунгі ўсерасійскай канфэрэнцыі РС-ДРП у студзені 1912 году і майскі рух». У гэтым артыкуле тав. Ленін аналізуе вынікі майскага руху 1912 году. Перш на перш тав. Ленін зварачае ўвагу на тое, што праклямацыя, якая была пашырана пецярбурскімі рабочымі ў першамайскае сьвята 1912 году, характарызуе вядомае становішча дэзарганізаванасьці сацыял - дэмакратычнай партыі ў Пецярбурзе. З чаго гэта відаць? Гэта відаць з таго, што гэта праклямацыя ня была падпісана Пецярбурскім камітэтам партыі, а асобнымі сацыял - дэмакратычнымі групамі і нават аднэй сацыял-рэвалюцыйнай рабочай групай. Гэты факт здарыўся таму, што царскі ўрад бязьлітасна руйнуе партыйныя сацыял-дэмакратычныя арганізацыі, арыштоўвае яе правадыроў, што прыводзіць да неабходнасьці стварэньня новых арганізацый замест зруйнаваных. Але трэба адзначыць, што гэтае хуткае ўзьнікненьне новых арганізацый, замест зруйнаваных, паказвае наколькі жыва падпольная партыя, наколькі яна гістарычна патрэбна. Такім чынам, само жыцьцё выравала ў карысьць бальшавікоў тыя вострыя спрэчкі, якія былі ў гады рэакцыі між бальшавікамі — меншавікамі — ліквідатарамі. «Падпольле патрэбна» — вось што гаварыла гісторыя—і гэты гістарычны заклік добра пачулі бальшавікі і за гэтае падпольле вялі рашучае змаганьне.

У праклямацыі першамайскага сьвята 1912 году сказана наступнае: «няхай нашымі лёзунгамі будуць: устаноўчы сойм, 8-мігадзінны рабочы дзень, канфіскацыя памешчацкіх зямель». Гэтыя лёзунгі былі тымі лёзунгамі, якія выставіла партыйная канфэрэнцыя ў студзені 1912 году. Той факт — кажа тав. Ленін — што вакол гэтых лёзунгаў аб'ядналіся ўсе разрозьненыя сацыял-дэмакратычныя групы і нават адна група рабочых - сацыялістых - рэвалюцыянэраў, паказвае тое, што лёзунгі бальшавізму зьяўляюцца сапраўды народнымі лёзунгамі, зразумелымі і неабходнымі для шырокіх мас рабочай клясы. Такім чынам, такое згуртаваньне розных частак рабочай клясы вакол лёзунгаў бальшавізму вырашала таксама ў карысьць бальшавікоў спрэчкі аб дзьвёх тактыках у гады рэакцыі — тактыцы рэвалюцыі, якую прапанавалі бальшавікі, і тактыцы ліквідацыі рэвалюцыі, якую прапанавалі амаль што ўсе меншавікі, за выключэньнем маленькай групкі плеханаўцаў.

Наступная рыса, якая характэрна для першамайскага сьвята 1912 г., заключаецца ў тым, што сотні тысяч Пецярбурскага пралетарыяту — а за імі і рабочыя ўсіх канцоў Расіі — пашлі на забастоўкі, на вулічныя дэманстрацыі ня ў якасьці аднаго з асобных кляс буржуазнага грамадзтва, «не са сваімі толькі прафэсыянальнымі лёзунгамі, але ў якасьці гегемона, падымаючага сьцягі рэвалюцыі за ўвесь народ, ад імя ўсяго народу, для прабуджэньня і прыцягненьня да змаганьня ўсіх кляс, каму свабода патрэбна, хто здолен дабівацца яе».

Што-ж, такім чынам, характарызуе першамайскае сьвята 1912 году? Самае характэрнае для гэтага сьвята тое, што яно сьведчыць аб узьнятасьці рэвалюцыйнага руху пралетарыяту Расіі на больш вышэйшую ступень. «Калі ў 1905 годзе ён (рэвалюцыйны рух — **Р. К.**) пачынаўся з масавых забастовак і гапанады, то ў 1912 годзе, ня гледзячы на паліцэйскі разгром, арганізацыя нашай партыі, рух пачынаецца з масавых забастовак і **падняцьця рэспубліканскага сьцягу.** Таксама першамайскае сьвята паказвае, што ў той час, як меншавікі толькі гаварылі аб аб'яднаньні рэвалюцыйных сіл, у нізох, у шырокіх масах рабочых пачынаецца аб'яднаньне на справе, — аб'яднаньне рабочых вакол рэвалюцыйных лёзунгаў бальшавізму. Рэвалюцыйны пралетарыят Пецярбургу адхіліў усе палавінныя лёзунгі ліквідатараў і зразумеў, «што трэба біць у ўпор, нападаць на крыніцу зла, руйнаваць усю сыстэму, увесь лад царскай чорнасоценнай Расіі».

* * *

15 (28) чэрвеня 1913 году тав. Ленін друкуе артыкул пад назвай: «Маёўка рэвалюцыйнага пралетарыяту». У гэтым артыкуле, як і ў папярэднім, ён аналізуе становішча Расіі, якое знайшло сваё выражэньне ў першамайскім сьвяце 1913 году, сьвята, якое «як маланка ў хмурай, змроклай і сумотнай атмасфэры прарэзала паветра». У 1913 годзе ўжо даволі высьветлілася, што стаўка на Сталыпіна гісторыяй была біта, што рэвалюцыя ў Расіі неабходна і што яна будзе. Аб надыходзячай рэвалюцыі гаварыў такі буйны гістарычны факт, як забастоўка 250 тысяч рабочых 1-га мая, а таксама вулічнай дэманстрацыі рабочых у гэты-ж дзень. Царскі ўрад убачыў, што «змаганьне ідзе не на жарт, што перад паліцыяй ня кучка цацачнай славянафільскай справы людзішак, што паўсталі сапраўдныя **масы** працоўных кляс сталіцы. У той час, як рабочая кляса, выражаўшая рэвалюцыйны настрой і імкненьне ўсіх працоўных Расіі, бадзёра ішла ўперад на змаганьне з царызмам, — царскі ўрад, наадварот, паказаў сваё бясьсільле перад рэвалюцыйным узбуджэньнем пралетарскіх мас. «Майская забастоўка — піша Ленін — як усе рэвалюцыйныя забастоўкі 1912-13 г. г., дасканала паказвае нам тры палітычныя лягеры, на якія дзеліцца сучасная Расія. Лягер катаў і прыгоньнікаў, манархія і ахранка. Ён ужо бясьсілен супроць рабочых мас. Лягер буржуазіі, якая ўся, ад кадэтаў да акцябрыстых, крычыць і стогне, заклікаючы да рэформ і сама сябе абвясьціла «ў дурнях» за дапушчэньне думкі, аб магчымасьці рэформ у Расіі. Лягер рэвалюцыі, які аднолькава выражае інтарэсы прыгнечаных мас».

У Расіі абвастрылася клясавае змаганьне. Зноў, як у рэвалюцыі 1905 году, было пастаўлена пытаньне аб лёсе царызму. Ужо ўсім было відавочна, што Сталыпіну, царскаму ўраду, не ўдалося пахаваць рэвалюцыю. Аб'ектыўныя ўмовы, якія выклікалі рэвалюцыю 1905 году, ня былі ліквідаваны і цяпер — у 1913 годзе — яны зноў зрабілі актуальным пытаньне аб рэвалюцыі. Суб'ектыўны фактар, які ня быў у поўнай меры ў рэвалюцыі 1905 году, у сучасны момант ўжо паказаў сваю амаль што поўную сьпеласьць. Ужо ўсім відавочна было, што не буржуазія, а пралетарыят зьяўляецца гегемонам у рэвалюцыйным змаганьні з царызмам. Таксама сялянства, прайшоўшае «школу» Сталыпіна, убачыла ў асобе пралетарыяту свайго сапраўднага кіраўніка ў змаганьні з памешчыкамі і іх дыктатурай. «Маёўка—пісаў тав. Ленін — бягучага году паказала ўсяму сьвету, што расійскі пралетарыят цьвёрда ідзе сваім уласным рэвалюцыйным шляхам, па-за якім няма ратунку для Расіі, якая задыхаецца і гніе зажыва».

Маёўка 1913 году паказала, што Расія зноў стаіць на парозе рэвалюцыі...

* * *

Праз чатыры гады — 20-га чэрвеня 1917 году — у артыкуле «18-га чэрвеня» тав. Ленін дае ацэнку пералежнаму сьвяту 1917 г.

Гэтыя чатыры гады багаты буйнымі гістарычнымі падзеямі. У 1914 годзе пачалася сусьветная імпэрыялістычная вайна, у якой Расія прымала ўдзел. У лютым месяцы 1917 г. адбылася лютаўская рэвалюцыя, якая скінула самадзяржаўе і, такім чынам, вырашыла галоўную задачу папярэдняга этапу рэвалюцыйнага руху. Партыя на сваёй красавіцкай канфэрэнцыі высунула лёзунг новага этапу рэвалюцыйнага змаганьня рабочай клясы, іменна змаганьня за ўстанаўленьне дыктатуры пралетарыяту і бяднейшага сялянства. Увесь пэрыяд ад лютаўскай рэвалюцыі да кастрычніцкай ішло змаганьне рабочай клясы пад кіраўніцтвам бальшавікоў за ажыцьцяўленьне гэтага лёзунгу.

Якія ўзаемаадносіны кляс у Расіі характарызавала першамайскае сьвята 1917 году? На гэта пытаньне тав. Ленін дае наступны адказ. Ён піша, што дзень 1-га мая 1917 году азначаў «пагалоўнае **ўшанаваньне** першай перамогі рэвалюцыі і яе гэрояў, поглад, кінуты народам назад, на пройдзены ім найбольш быстра і найбольш усьпешна першы этап да свабоды. Першае мая было сьвятам пажаданьняў і надзей, зьвязаных з гісторыяй сусьветнага рабочага руху, з яго ідэалам міру і сацыялізму». І далей. «Першамайская дэманстрацыя не задавалася мэтай указаць **кірунак** далейшага руху рэвалюцыі і не магла ўказаць яго». Яна ня ставіла «перад масамі і ад імя мас канкрэтных, акрэсьленых, надзенных пытаньняў аб тым, куды і як павінна пайсьці рэвалюцыя» (падкрэслена мною —**Р. К.**).

Такім чынам, першамайскае сьвята 1917 году паказала, што шырокія масы рабочых **яшчэ** не ўявілі сабе існасьці новага этапу рэвалюцыі і яшчэ жылі больш учарайшым днём. Такія настроі мас спрыялі таму факту, што кіраўніцтва шырокімі масамі рабочых і сялян знаходзілася яшчэ ў руках здрадніка—меншавікоў і эсэраў.

Рашучы пералом у бок пралетарскай рэвалюцыі паказала дэманстрацыя 18 чэрвеня, быўшы адным «з дзён пералому» (Ленін). Буржуазная рэвалюцыя на ўсіх парах перарастала ў пралетарскую. Масы пашлі на штурм капіталізму.

* * *

Як мы бачылі, дакуманты тав. Леніна, зьвязаныя з першамайскім сьвятам, характарызуюць розныя этапы клясавага змаганьня рабочай клясы за сваю капчатковую мэту — за камунізм. Рабочая кляса ішла з кожным годам ад ніжэйшых этапаў свайго змаганьня да ўсё больш вышэйшых этапаў змаганьня са сваімі клясавымі ворагамі. У Кастрычніцкую рэвалюцыю пралетарыят Расіі ажыцьцёвіў сваю асноўную задачу ва ўмовах капіталізму: буржуазія была зьвергнута, пралетарыят устанавіў сваю дыктатуру.

Пачынаюцца новыя этапы змаганьня пралетарыяту ўжо на базе існаваньня дыктатуры пралетарыяту. І тут мы назіраем, што пралетарыят нашай краіны ідзе ўсё больш і больш разгорнутым фронтам да асноўнай мэты дыктатуры пралетарыяту — да пабудовы сацыялізму ў СССР.

* * *

У гэтым годзе — у 1930 — першамайскае сьвята адбываецца ва ўмовах бурнага разгортваньня індустрыялізацыі і калектывізацыі нашай краіны. Пралетарыят нашай краіны ўжо блізка падыходзіць да пабудовы сацыялізму.

Параўнаем 1896 год, калі тав. Ленін пісаў свой заклік да рабочых Пецярбургу з тымі лёзунгамі першамайскага сьвята, якія высунула наша партыя ў гэтым 1930 годзе. Які шлях пройдзен пралетарыятам ўсяго за 34 гады? Гэта тэмп разгортваньня клясавай сьвядомасьці і клясавага змаганьня рабочай клясы зусім ня чуваны і наогул дзіўны.

Гістарычныя ўмовы Расіі зрабілі наш пралетарыят найбольш рэвалюцыйным, найбольш адданым справе камунізму. Ён паказаў цуды гэраізму, ён паказаў ужо ня толькі здольнасьць устанавіць сваю дыктатуру, але і здольнасьць пабудаваць новую эканоміку—сацыялізм. І гэта здольнасьць у значнай меры тлумачыцца тым, штопралетарыят нашай краіны меў такога геніяльнага правадыра-рэвалюцыянэра, як тав. Ленін.

Р. КУГЕЛЬ.

*) Канец. Пачатак глядзі ў «Зьвязьдзе» № 101.

За што судзілі рабкора Зуева

(З ЗАЛІ ПАСЯДЖЭНЬНЯЎ СУДУ)

У Аршанскім прыгародным спажывецкім таварыстве «Чырвоны Араты» знайшла сабе цёплы прытулак група былых гандляроў, спэкулянтаў, злачынцаў і кулацкіх сынкоў, якія займаліся шкодніцтвам і прынесьлі шмат страт капэрацыі.

Актыўны рабкор **Зуеў**, рабочы - мэталісты, вярнуўшыся з Чырвонай арміі, дзе ён праслужыў 7 год, паступіў на работу ў якасьці загадчыка крамы «Чырвоны Араты». Тав. Зуеў, апынуўшыся ў асяродзішчы чужых элемэнтаў, ня мог пагадзіцца з такім асяродзішчам і пачаў сыгналізаваць аб гэтай небясьпецы ў газэтах: «Камуністычны Шлях», «Зьвязда» і «Рабочай». **Па яго заметках праўленьне «Чырвоны Араты» на чале са старшынёю Скапцом перадаецца суду. За рад злачынстваў старшыня праўленьня Скапец атрымаў ад суду паўтара гады пазбаўленьня волі, а другі член праўленьня — паўгода.**

З гэтага моманту і пачынаецца рабкораўская дзейнасьць Зуева. Ён трапіў на недахопах, якія былі ў іншых арганізацыях і ўстановах. **Зуеў выкрывае няправільнае атрыманьне сукна на гарнітуры адказнымі працаўнікамі ў «Чырвоным Аратым» з фонду прэміяваньня ільнаводаў.**

І вось Зуева, як актыўнага рабкора, пачынаюць шалёна праследаваць. Гэта група былых гандляроў, спэкулянтаў і кулацкіх сынкоў — прыхільнікаў Скапца — групуе кампрамэтуючы матар'ял супроць Зуева. Яму прыпісваюць абвінавачаньне, што ён — **белагвардзеец, мае сувязь з прыватнікамі, а калі гэта не ўдаецца, дык яму прыпісваюць віну ў растраце.**

Праз кулацкіх сынкоў **Далідовічаў** таксама накрыўдженыя выкрываючымі заметкамі Зуева стараюць судовы працэс над ім. У Далідовіча не хапае каля **8.000 руб.** Пачынаюць шукаць і правяраць. Зуеў знаходзіць у сваіх паперах накладную на 6.000 руб., па якой ён атрымаў ад Далідовіча тавары, але гэтыя 6.000 руб. з Далідовіча ня сьпісаны, і калі Зуеў заяўляе аб гэтым у бухгальтэрыю, дык з Далідовіча праўленьне «Чырвонага Аратага» сьпісвае гэтыя 6.000 руб. Усё-ж такі ў Далідовіча не хапае яшчэ каля 2.000 руб. і тут Далідовіч фабрыкуе фальшыўку — накладную без подпісаў Зуева — і тлумачыць, што па ёй Зуеў атрымаў ад яго тавары, а праўленьне за гэта з вялікай радасьцю хапасьціла, як за саломінку, і далучае да справы супроць Зуева.

Акрамі таго, да справы Зуева прыпісваюць абвінавачаньні ў перавышэньні расцэнак на тавары, ня гледзячы на тое, што такія перавышэньні былі ва ўсіх крамах «Чырвонага Аратага».

Зуеў павінен быў атрымаць 27 кіп мануфактуры ад Днепрасаюзу. Гэту мануфактуру з Днепрасаюзу ён атрымлівае часткамі, без расьпісак і замест 27 кіп Зуеў атрымаў толькі 23. Зуеў падае заяву аб недаатрыманьні ў праўленьне «Чырвонага Аратага». Яго там супакойваюць тым, што сьпіцуць з яго гэтыя 4 кіпы, а ўрэшце гэту новую фальшыўку далучаюць да судовай справы. Заблытанасьць і адсталасьць бухгальтэрыі ў «Чырвоным Аратым» таксама грала на руку гэтай групе шкоднікаў і злачынцаў, што спрыяла стварэньню судовага працэсу.

Такімі агіднейшымі спосабамі цкавалі рабкора Зуева.

Уся гэта агідная справа прымусіла яго адмовіцца ад сваёй пасады. Каля году Зуеў хадзіў без работы. **Акруговая РСІ, пракуратура бачылі ў Зуеву толькі злачынцу - растратчыка.** Апошнія не зразумелі ўсяго палітычнага сэнсу і злачынства групы чужых элемэнтаў з «Чырвонага Аратага», якія цкавалі Зуева, як рабкора. **АКК-РСІ нячула падыходзіла да справы Зуева. Пракуратура і сьледчыя органы цягнулі справу Зуева больш году і дапусьцілі да таго, каб Зуеў сеў на лаўку падсудных.**

Справай рабкора Зуева заняцца вызная сэсія Вярхоўнага суду. Перад Вярхоўным судом прайшла ўся гэта галерэя шкоднікаў у якасьці сьведкаў, якія імкнуліся даказаць віну Зуева, але так заблыталіся, што самі сябе выкрылі.

Вярхоўны суд палажыў канец гэтай справе і вынес правільную палітычную ацэнку ў сваім прыгавары ўсёй гэтай чарговай агіднейшай справе цкаваньня рабкора з боку чужых нам элемэнтаў. Улічваючы ўсе акалічнасьці справы, на дасяты дзень працэсу **дзяржаўны абвінавачвач адмаўляецца ад абвінавачаньня Зуева. Вярхоўны суд знаходзіць высунутыя супроць Зуева абвінавачаньні недаказанымі і яго апраўдаў.**

Такім чынам, рабкор Зуеў рэабілітаваны Вярхоўным судом, але, каб даказаць гэта, патрэбна было 11 дзён судовага сьледзтва. Патрэбна было патраціць шмат часу і выдаткаў з боку дзяржавы і толькі таму, што судовыя і сьледчыя органы так доўга зацягнулі гэту справу. З прычыны аднабокага падыходу да справы Аршанскай РСІ, актыўны рабкор Зуеў трапіў на лаўку падсудных і быў прымушан цэлы год хадзіць без работы.

Адпаведным арганізацыям трэба заараз-жа зрабіць належныя вывады з гэтага і ўдарыць па руках глушыцеляў самакрытыкі і вінаватых у стварэньні гэтага судовага працэсу.

ЦУДЗІН.

У менскім спраўдоме ня усе добра

За апошні час у Менскім спраўдоме наглядаюцца абураючыя факты нядбайнасьці і недысцыпліінаванасьці з боку наглядчыкаў да сваіх службовых абавязкаў. У асяродку асабовага складу работнікаў спраўдому выяўлены злачынныя элемэнты.

Двух з наглядчыкаў Менспраўдому гэтымі днямі крымвышук затрымаў у адным з прытонаў у вельмі «цёплай» кампаніі. У міліцыі яны паводзілі на сабе вопратку і хуліганілі.

Наглядчык П. выказваў свае «папраўчыя» здольнасьці ў адносінах да злачынцаў у тым, што **ўжываў у якасьці мэтадаў «спраўленьня» сыстэматычныя збіваньні і зьдзекі са зьняволеных.** Гэтае сваё злачынства ён праводзіў праз крымінальнікаў, маючы пры гэтым на мэце атрыманьне хабару. Асабліва наглядчык П. зьдзекваўся са зьняволеных яўрэяў, якіх ён пераводзіў у горшыя камэры, прымушаў другіх зьняволеных дамагацца ад сваіх ахвяр грошай, ужываючы зьдзекі. У наглядчыка П. ня было вызначнай «таксы». Ён браў у залежнасьці ад маемаснага стану як грашыма, так і натура-прадуктамі. **Калі П. заўважыў у аднаго зьняволенага ў карцары новыя галёшы, дык ён з ім замяніўся на старыя і за гэта перасадзіў яго ў агульную камэру.** Хабары П. браў за ўсё: за прагулку і за іншыя законныя і незаконныя палёгкі. **За добрую ўзнагароду забясьпечваў зьняволеных гарэлкай.**

Наглядчык пры цагельні спраўдому, у ноч пад вялікдзень, парушыў правасьці гэту ноч, як належыць «сумленнаму хрысьціяніну, пакінуў без нагляду зьняволеных і пайшоў у горад. Паводле яго прыкладу, зьняволеныя таксама пайшлі ў горад «сьвяткаваць».

Усе гэтыя чатыры «працаўнікі» з работы зьняты. Супроць іх узбуджаны **крымінальныя справы, першыя трое арыштаваны.**

Але на гэтым супакоіцца нельга. **Ад пэрсаналу спраўдому,** які знаходзіцца ўвесь час сваёй службы **ў асяродзішчы злачыннага элемэнту — патрабуецца надзвычайная вытрыманасьць, адданасьць да даручанай справы,** здольнасьць праводзіць правільную папраўчую, працоўную палітыку савецкай улады, сучасны-ж склад часткі нізавых работнікаў спраўдому нельга лічыць цалкам адпавядаючым свайму прызначэньню.

З тае прычыны, што аплата служачых у спраўдоме вельмі нізкая, штат там часта мяняецца. Сярод работнікаў спраўдому існуе погляд, што спраўдом, як месца службы, зьяўляецца **«фабрыкай членаў саюзу».** Там служаць толькі да ўступленьня ў саюз, атрыманьня членскай кніжкі. Партыйны склад работнікаў спраўдому вельмі нізапачны. **Прафсаюз амаль ніякай работы ў спраўдоме сярод служачых не вядзе,** ня гледзячы на спэцыфічныя ўмовы іх працы, на асаблівую іх адсталасьць.

Па гэтых пытаньнях трэба завастрыць увагу. Трэба палепшыць матар'яльна-бытавыя ўмовы работнікаў спраўдому. Трэба ўзмацніць партыйнае ядро работнікаў. Прафсаюзу неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу на разгортваньне выхаваўчай працы сярод работнікаў спраўдому, як найбольш адсталую групу. Трэба сур'ёзна задумацца над гэтай «фабрыкай членаў саюзаў».

Адміністрацыі спраўдому трэба ў сваю чаргу прыглядзецца да свайго асабовага складу работнікаў. Трэба ўзмацніць нагляд за служачымі, бо толькі недаглядам магчыма вытлумачыць злоўжываньні, якія на працягу доўгага часу беспакарана рабіў наглядчык П. і яму падобныя.

К.—В.

Пераходны сьцяг--камсамолу „Камунара“

Камсамольцы—„камунараўцы“ варты ўзнагароды

Камісія Фрунзаўскай раённай канфэрэнцыі рабочай моладзі перадала **камсамольскаму калектыву заводу «Камунар» пераходны сьцяг за лепшы ўдзел у сацспаборніцтве.**

Ня гледзячы на рад труднасьцяй (перабоі ў рабоце з прычыны недахопу сырцу і інш.), завод «Камунар» выканаў свой прамфінплян **на 104 проц.,** сабекошт зьніжаны **на 29 проц.** (плянам было вызначана 26 проц.), прадукцыйнасьць працы павялічылася на 35 проц., замест 17. У гэтых дасягненьнях значны і прыкладны ўдзел прымаў камсамольскі калектыў: увесь калектыў абвясьціў сябе ўдарным. Паводле ініцыятывы камсамольцаў, арганізаваліся ўдарныя камуны. Камсамольскі калектыў вёў барацьбу з рвацтвам, іржэ-ударніцтвам і прагуламі (двух камсамольцаў выключылі з ЛКСМБ, іншым прызначылі спагнаньне).

З агульнай сумы прэмій—1.035 руб. за рацыяналізатарскія мерапрыемствы, каля 600 руб. прыпадае на камсамольцаў. Група камсамольцаў сьлясарнага цэху зьнізіла расцэнкі па 15 проц. Камсамольцы такарнага цэху зьнізілі па 35 проц. 40 камсамольцаў прымае ўдзел у чыстцы апарату ВСНГБ і пры праверцы ўдарніцтва.

Камсамольскі калектыў заводу «Камунар» ужо ў другі раз атрымлівае пераходны сьцяг.

Камсамольцы-камунараўцы з гонарам заслужылі ўзнагароду.

Ц.

Прастоі па віне друкарні

Дзярждрукарня БДВ паводле дагавору з дражджавым заводам **«Чырвоная Зара»,** навіна сваячасова забясьпечваць завод этыкетамі. Але друкарня дагавору ня выконвае. Па 4-5 гадзін прымушаны чакаць фурманкі «Чырвонай Зары» па дварэ друкарні, пакуль загадчык друкарні «міласьціва» згодзіцца пачаць друкаваць этыкеты. Апрача таго, этыкеты ня зусім добраякасныя — друкарня ня прытрымліваецца стандарту. З прычыны таго, што друкарня ня выконвае дагавору, у пакавальным цэху «Чырвонай Зары» бываюць прастоі.

Друкары, за вамі слова!

А. М.

ДА ВЕДАМА ПАДПІСЧЫКАЎ «ЗЬВЯЗДЫ».

Газэта «Прафрух» № 9 разаслана 30 красавіка. ЧАРГОВЫ НУМАР газэты «ПРАФРУХ» выйдзе 11-га МАЯ.

АДПУСКНІКІ!

ВАМ БУДЗЕ ПАСЫЛАЦЦА газэта „ЗЬВЯЗДА“ па месцы знаходжаньня ў водпуску без асобнай даплаты.

Незабудзьцеся паведаміць у к-ру газэты «Зьвязда»

ВАШ НОВЫ АДРАС.

МЕНСК

Электрыфікацыя ўсебеларускай с.-г. выстаўкі

Электра - тэхнічны трэст прыступіў да электрыфікацыі ўсіх павільёнаў усебеларускай с.-г. і прамысловай выстаўкі. Работа вядзецца ва ўдарным парадку. Устанаўляюцца дзесяткі матораў. Усё электра - абсталяваньне ёсьць ужо на месцы.

З Масквы прыбылі экспанаты электра-прамысловасьці, якія будуць разьмешчаны ў агульным павільёне ўсесаюзнай прамысловасьці.

Пажарнікі разьбягаюцца

З прычыны малога акладу пэнсіі пажарнікам, якія працуюць у пажарных камандах Менску, часта назіраецца пакіданьне імі работы. Пажарнікі шукаюць сабе пабочных заработкаў і імкнуцца перамяніць месца работы, а таму штодзённа ў пажарных камандах зьмяняецца па два, па тры новыя работнікі ў дзень. Такое становішча паслабляе працаздольнасьць пажарных каманд г. Менску.

Перад Наркампрацы ня раз узьнімалася пытаньне аб павялічэньні пэнсіі пажарнікам, але да гэтага часу вынікаў няма, і ўцяканьне прымае ўсе большыя і большыя разьмеры.

Кавіны МЦРК

З 3-га мая МЦРК пачынае выдаваць пайшчыкам па наборных кніжках і часовых картках сэзоннікаў мануфактуру па 10 мэтраў на ўтрыманца для 1-й катэгорыі і па 5 мэтраў для II і III-й катэгорыі.

Выдача будзе праводзіцца па талёне жоўтага колеру, № 12. Курсанты розных каротка-тэрміновых курсаў, ня пайшчыкі ЦРК, мануфактуру не атрымаюць (атрымліваюць у Тэкстыльгандлі).

Усе пайшчыкі, якія яшчэ не атрымалі мануфактуры па талёне № 38, **паявых кніжак,** змогуць атрымаць яе толькі да 15-га мая.

Адбыўся выпуск 4-месячных курсаў кухароў. Курсы скончылі 22 чал., курсанты былыя кухонныя работнікі і хатнія работніцы. Скончыўшыя пасланы на працу ў сталоўкі ЦРК намочнікамі кухароў.

***

МЦРК увёў для буфэтчыкаў новую дысцыпліну па вывучэньні вучоты і справаздачнасьці буфэтаў.

***

Пачалі працаваць дзьве новыя групы з 45 прыказчыкаў і 30 буфэтчыкаў, якія скончылі месячныя курсы МЦРК. Скончыўшыя ўзяты праз Біржу працы, або вылучаны каапэрацыйнымі камісіямі фабрык і заводаў.

Чаму склікаецца першы ўсебеларускі энэргетычны зьезд

Вызначаныя пяцігодкай пляны здабычы апалу і энэргабудаўніцтва ўжо робяцца «вузкім месцам» і абумоўліваюць разрыў і неадпаведнасьць паміж тэмпамі разьвіцьця народнае гаспадаркі і ростам апалавае і энэргетычнае гаспадаркі.

Для забесьпячэньня бесьперабойнай работы існуючых прадпрыемстваў і новых прамысловых гігантаў, аграіндустрыяльных камбінатаў, чыгуначнага і воднага транспарту, трэба неадкладна пашырыць апалавую базу, павялічыць аб'ём і маштаб вытворчасьці асноўнага і дапаможнага энэргаабсталяваньня (катла-турба—дызэлябудаўніцтва і г. д.) і, нарэшце, ужыць усе магчымыя меры ў напармку вядзікай і малой рацыяналізатыі апалакарыстаньня і зьніжэньня ўдзельных выдаткаў апалу ва ўсіх галінах народнае гаспадаркі, а таксама і хатнім і бытавым спажываньні.

Вось асноўныя шляхі для ліквідацыі «вузкіх месц» і радыкальнага вырашэньня вострай апалавай праблемы.

Па лініі павялічэньня здабычы апалу вызначаецца, паводле новага варыянту, давесьці яе да канца пяцігодкі да 180 міл. тон умоўнага апалу, замест зацьверджаных раней 130 міл. У прыватнасьці, здабыча торфу павялічваецца да 33 міл. тон паветрана-сухога торфу, замест 16 міл. тон паводле пяцігодкі. Адначасова з пашырэньнем здабычы мясцовых, нізка-гатунковых і малацэнных відаў апалу, асноўны ўпор робіцца на фарсаваньне будаўніцтва на асноўных вугольных басэйнах (Данецкі і Кузьнецкі) і пабудаваньня чыгуначных зьвышмагістраляй да галоўнейшых спажываючых раёнаў (цэнтральна-прамысловая вобласьць, паўночна-заходняя вобласьць і інш.).

Па лініі рацыяналізацыі энэргагаспадаркі, асноўнымі мэтадамі застаюцца: пабудаваньне цеплавых і гідраўлічных раённых электрастанцый на мясцовых відах апалу з высокім каэфіцыентам карыснага дзейства ўстаноўкі і перадачай электраэнэргіі на адлегласьці, пабудоваў цепла-электра-цэнтраляй на прамысловых прадпрыемствах, а таксама ў гарадох з цёплафікацыяй іх.

Гэтыя грандыёзныя задачы, зразумела, могуць быць пераможаны толькі шляхам максымальнага ўцягненьня і актывізацыі навукова-тэхнічных работнікаў краю, абмеркаваньня **ўсіх** пытаньняў у грамадзкай арганізацыі. Такой арганізацыяй і зьяўляецца **Ўсесаюзны энэргетычны камітэт,** выбраны 1-м усесаюзным энэргетычным зьездам. Камітэт за апошні час разгарнуў вялікую арганізацыйную і плённую практычную работу, узварушыў грамадзкасьць і ўсю масу энэргетыкаў, пачынаючы ад прафсаюзу ВТНУ да качагараў.

БССР крыху спазьнілася з арганізацыяй такога згуртаванага пэнтру грамадзкай энэргетычнай думкі. Цэлы рад пляновых, тэхнічных і эканамічных пытаньняў у сувязі з пашырэньнем нашай энэргетычнай базы, з пабудовай магутных раённых электрастанцый (Асінаўская 1-й і 2-й чаргі 2 гомельская гідрастанцыя, гідрастанцыя на Кабылянскіх паротах і г. д.), пабудовай многіх цёпла-электрацэнтраляй на прамысловых камбінатах і ў гарадох (Менская новая станцыя, Добруская фабрыка, Гомельскі дрэваапрацоўчы камбінат і г. д.) чакаюць прапрацоўкі і абмеркаваньня кампэтэнтнымі грамадзкімі арганізацыямі.

Праблема «тарфікацыі» рэспублікі ў працягу бліжэйшых год, г. ё. перавод прадпрыемстваў, устаноў і насельніцтва на тарфяны апал, праблема эканамічнага раёнаваньня апалу і г. д., патрабуюць хутчэйшай рэканструкцыі ўсяе цёпла-сілавое гаспадаркі.

Скліканьне 1-га ўсебеларускага энэргетычнага зьезду ў бліжэйшы час мае на мэце згуртаваць вакол сябе ўсіх энэргетыкаў рэспублікі, наладзіць пастаянны кантакт і жывую цесную сувязь з цэнтрам.

Зьезд павінен будзе выбраць працаздольны сталы орган — энэргетычны камітэт з паасобнымі сэктарамі, якому трэба будзе нагнаць прапушчаны час і прарабіць вялікую работу на карысьць нашае народнае гаспадаркі.

Інж. Рыўкін.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

Агульна-гарадзкі вечар рабочай моладзі, прысьвечаны 9-цігодзьдзю «Чырвонай Зьмены» і дню друку, адбудзецца сёньня ў 19 гадз. у Доме Селяніна. Пасьля афіцыйнай часткі—вялікі канцэрт. Уваход па запрашальных білетах.

Сёньня, 4-га мая, у 20 гадз. у ДОМЕ КАМАСЬВЕТЫ адбудзецца даклад для парт. і камс. актыву аб дні друку. Пасьля — мастацкая частка. Білеты па РК КП(б)Б і ЛКСМБ.

Фрунзаўскі РК КП(б)Б паведамляе, што 4-га мая г. г. роўна а 6-ай гадз. увечары ў памяшканьні клюбу друкароў (Лепінская, 13) склікаецца раённы куставы сход наступных ячэек:

Ф-кі, «Акцябр», п.-к. краўцоў, футравая фабрыка, Наркамгандлю, Дзяржгандлю, працкалектыў рымароў, п.-к. абутнікаў, ф-ка «Чырвоны Тэкстыльшчык», ф-ка «Беларуска», міліцыя, Белдзяржстрах, пажарная каманда, Наркампрацы, Белдзяржспірт, паштова-тэлеграфная кантора, 1-ая больніца, 2-ая больніца, ЦРА, прыгародны сельсавет, дасьледны інстытут, саўгас «Чырвоны Транспарт», саўгас імя Лекерта, саўгас «Вольная Праца», цэнтральная Бульбяная станцыя, палітэхнікум, яч. антэчн. устаноў, яч. камгасу.

Ідучы на сход усіх членаў і кандыдатаў вышэйпамянёных ячэек АБАВЯЗКОВА.

ФРК КП(б)Б.

СЁНЬНЯ

Дом Камасьветы. У 19 г., пак. 21 індывід. кансульт. па матэматыцы і фізіцы т. **Гельфанда.**

— У 19 г., пакой 3, заняткі гуртка ангельскай мовы.

Дом Працасьветы. У 20 г. адкрыты сход яч. ЛКСМБ палітасьветных устаноў. Парадак дня: 1. Пастанова бюро калектыву аб працы ячэйкі.

— У 20 г. вечар для тэхнікаўпікоў членаў саюзу працасьветы. Уваход па кн. і запраш. біл.

— У 12 г. ранішнік для дзяцей чл. саюзу Працасьветы.

Ад ЦК ЛКСМБ. У памяшканьні ЦК (вул. К. Маркса) у 15 г. склікаецца нарада па пытаньні аб прыезьдзе кіеўскага яўрэйскага ТРАМ'у ў БССР, на якую запраш.: Дыла — Галоўмастацтва, Шамшур — ТРАМ, Чорнабродаў і Ошараў — НКА, Ашаровіч — БАН, Дунец — газ. «Акцябр», Гэршанбаум — акр. інспэктарыят асьветы, Клімковіч — ЦСПСБ, прадстаўнікі: саюзу мастацтва і пасрэднік саюзу мастацтва, саюзу швэйнікаў, гарбароў і друкароў, Мятліцкі — АК ЛКСМБ, Экельчык — Фр. РК ЛКСМ, Рубенчык — Кастр. РК, Росін — Бел.АПП, Харыя — часоп. «Штэрн», Дубравіцкі — рэд. «Юнг. Арбэйтэр», і Вайнгауз — рэд. «Юнг. Ленінец».

ЗАЎТРА

БДУ (фіз. аўд.). Пасядж. Менскай сэкцыі матэм.-фіз. асацыяцыі. Даклады: праф. Громэр—Азначэньне масы, ён-жа—агульнае значэньне комплексных лікаў і дац. Дыдырка — Новыя спосабы пабудаваньня цыркулярных крывых у сувязі з клясыфікацыяй відомых спосабаў. Пач. у 17 гадз.

Нэрвовая клініка. У 20 гадз. пасядж. фізыо-тэрапэўтычнай сэкцыі навуковай асацыяцыі: 1. Д-р Б. Цыпкін—арганізм. мер. барацьбы са скрыўленьнямі пазваз. у дзіцячым узросьце. 2. Дац. М. Шапіра—аб некаторых «спэцыф.» зьменах у мускулах пры некат. ортапэўдычных захвораньнях.

На пабудову трактара «Фізкультурнік Меншчыны». Студэнты 4-га курсу літаратурнага аддзяленьня БДУ ўносяць на трактар «Фізкультурнік Меншчыны» 75 руб. і выклікаюць усе выпускныя курсы пэдфаку.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

ПАДПІШЭЦЕСЯ на „ЗЬВЯЗДУ“ на МАЙ і наступныя месяцы

ПАМЯТАЙЦЕ, што ў маі АДКРЫВАЕЦЦА XIII ЗЬЕЗД КП(б)Б

РАБОТА ЗЬЕЗДУ БУДЗЕ АСЬВЯТЛЯЦЦА НА СТАРОНКАХ „ЗЬВЯЗДЫ“

КАСТРЫЧНІЦКІ РАЙКОМ КП(б)Б

склікае 6 мая, а 7 гадзіне ўвечары

НАРАДУ ўпоўнаважаных па „ЗЬВЯЗЬДЗЕ“

Упоўнаважаныя ад партыйных і іншых сходаў у дзень нарады **ВЫЗВАЛЯЮЦЦА**

Нарада адбудзецца у памяшканьні райкому

Райком КП(б)Б

КАСТРЫЧНІЦКІ РК КП(б)Б СУМЕСНА З ЦСПСБ склікае сёньня а 1 гадз. у клюбе мэталістых (Унівэрсытэцкая, 12)

шырокую беспартыйную рабочую канфэрэнцыю Кастрычніцкага раёна

Парадак дня: 1. Міжнароднае і ўнутранае становішча і задачы рабочае клясы (дакл. т. ГАЛАДЗЕД).

2. Аб шэфстве прадпрыемстваў над установамі (т. РЫСКІН).

Усе дэлегаты, якія не змаглі атрымаць мандатаў на прадпрыемствах, павінны атрымаць іх у РК КП(б)Б (вул. Урыцкага) да 5-ці гадзін дня.

ДОМ ПІСЬМЕНЬНІКА (Савецкая, 68)

5 МАЯ

пісьменьнікі сьвяткуюць дзень друку

ВЯЛІКІ ВЕЧАР з наступнай праграмай:

1. Даклад — ПІСЬМЕНЬНІК І ДРУКАВАНАЕ СЛОВА.
2. КАНЦЭРТ (сьпевы, скокі, балет, мастацкае чытаньне, музыка і г. д.)
3. У парадку самадзейнасьці —гульні, чытка новых твораў, гумар.

Запрашаюцца пісьменьнікі і іх сем'і, для якіх уваход вольны, іншыя па запрашальных білетах, якія можна атрымаць у загадчыка Дому Пісьменніка.

Пачатак а 8 гадз.

ПРАЎЛЕНЬНЕ ДОМУ ПІСЬМЕНЬНІКА.

Група таварышоў райпартактыву выказвае глыбокае спачуваньне сем'і памёршага члена КП(б)Б Астрашыцка-Гарадзецкай райпартарганізацыі

Т. НЯВОРСКАГА П. Д.

Камітэт па будаўніцтве пры Эканомнарадзе БССР з жалем паведамляе аб дачаснай сьмерці работніка Камітэту, інжынэра

Івана Міхайлавіча КУПЛЕНСКАГА

Вынас цела (1-я Доўгабродзкая, 17) адбудзецца 4 мая ў 4 з пал. гадз. дня.

ТЭАТР і КІНО

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР

Сезон 1929-1930 году (чацьверты) у Менску

Нядзеля 4 мая для саюзу Швэйнікаў

„Калі пяюць пеўні“

Рэшта білетаў у касе тэатру. Пачатак а 8 г. 30 м.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР

Аўторак, 6 мая

РАЗЬВІТАЛЬНЫ КАНЦЭРТ дзяржаўнага КВАРТЭТУ ІМЯ ВІЛЬОМА

У праграме: Чайкоўскі, Барадзін, Равель, Казіцкі, Фамейка.

Пачатак а 8 з пал. гадз.

Білеты ў касе тэатру і у Рабкасе.

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА

ПРЭМ'ЕРА ПРЭМ'ЕРА

Вытворч. „Грузкіно“

БОГ ВАЙНЫ (БЕЛЫЙ ВСАДНІК) у 6 частках.

Зьвыш праграмы—кіно-штомесячнік вытворч. Белдзяржкіно. «Беларусь Савецкая» № 4

Пач. сэанс: а 7 г., 8 г. 30 м., 10 г. 15 м.

Каса—ад 5 г. увеч.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ

2-гі тыдзень 2-гі

Мастацкі нямецкі фільм паводле навэлі Стафана Цвэйга

СТРАХ драма ў 8 частках.

Пачатак 1 сэансу а 7 г.

Каса адкрыта ад 5 гадз.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр“

МАСТАЦКІ ФІЛЬМ

ГАЛУБЫ ЭКСПРЭС у 5 частках

Пачатак 1-га сэансу а 2 г., 2-га—а 3 г. 30 м.

Каса адкрыта з 12 гадз.

КІНО СПАРТАК

БАЯВІКІ БАЯВІКІ

„ЛЕОН КУТЮРЬЕ“ драма ў 6 частках.

Каса—ад 5 гадз. 30 м.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“.

Ад нядзелі, 4-га мая замежны мастацкі фільм

ЧАЛАВЕК, ЯКІ СЬМЯЕЦЦА

па раману Віктара Гюга.

У галоўнай ролі: КОНРАД ВЭЙДТ.

Пачатак 1-га сэансу а 7 г. увечары. КАСА ад 5 гадз.

ЗЬБІРАЙЦЕ ЛЕКАВЫЯ ТРАВЫ!

Вучні школ і піянэр-атрады! Арганізуйце брыгады па зборы лекавых траў. Ке давайце гінуць у палёх сотням тысяч рублёў!

Збор лекавых траў—

ДОБРЫ ЗАРАБОТАК

для дзяцей беднаты.

Белмэдгандаль у бягучым годзе, як і ў мінулыя гады, ПРАЗ УСЕ АПТЭКІ ў раёнах і ў гарадох Беларусі купляе высушаныя лекавыя расьліны: валер'яну, белену, талакнянку, бялянку, пазынь (ліст), лінавы цьвет, чарніцы, лікаподзі (дзераза), маліну сушаную, ядловец (ягады), спарышню (чорныя ржкі жыта), дуброўку—корань, крапіўны ліст, кару крушыны, кмец, смарчкі, хвайныя пупышкі, рабіны (ягады), адуванчык (корань), мурашкавыя яйкі, канюшыну чырвоную, аерны корань

АЧЫШЧАНЫ.

Па ўсіх пытаньнях зварачвацца ў бліжэйшую аптэку.

Белмэдгандаль, Менск, Пляц Волі, 2а.

ДЗЯРЖГАНДБЕЛ КУПЛЯЕ **ДЫВАНЫ:** пэрсыдзкія, тэкінскія, каўкаскія, коўры старыя ручной работы.

Пры неабходнасьці экспэрт высылаецца для агляду.

Зварачацца: Менск, пляц Волі, 7, тэл. 16-92, ДЗЯРЖГАНДБЕЛ.

Для здачы АБВЕСТКІ ў газэту „ЗЬВЯЗДА“ званіце па тэл. **7-81**

АБВЕСТКА

Даводзіцца да ведама ўсіх дзяржаўных, каапэрацыйных і грамадзкіх арганізацый гор. Менску, што

ПРЫ КІРАЎНІЦТВЕ ЎПАЎНАВАЖАНАГА НКШЗ пры СНК БССР

)—(маецца)—(

СТАЛЫ ПРАДСТАЎНІК ДНЯПРОЎСКАГА РАЧНОГА ФЛЁТУ.

Просьба ўсе зацікаўленыя арганізацыі па ўсіх пытаньнях, зьвязаных з перавозкай грузаў у чыгуначна-водных зьмешаных зносінах,

зьвяртацца за ўсякімі даведкамі ў Кіраўніцтва Ўпаўнаважанага НКШЗ пры СНК БССР.

Ч. В. Аб. Нам. Упаўнаважанага НКШЗ пры СНК БССР В. КАМЕНШЧЫКАЎ.

СЕКАРОВСКАЯ ЖИДКОСТЬ

ПРЕЙСКУРАНТ ВЫСЫЛАЕТСЯ БЕСПЛАТНО

ЦЕНА ФЛАКОНА 2 руб. ВО ВСЕХ АПТЕКАХ.

При отсутствии высылаем 2 фл. за 4 руб. с пересылкой, по получении задатка.

ЛАБОРАТОРИЯ КООПЕРАТИВА

АЛЕН-МОСКВА

МОСКВА 55, 2ая ВЫШЕСЛАВЦЕВ ПЕР. №3

Да ведама студэнтаў зовочнага рабфаку

Дэканат Менскага Завочнага Рабфаку даводзіць да ведама студэнтаў, што з 20 ПА 25 МАЯ г. г. адбудзецца

праверка ведаў студэнтаў рабфаку

і канфэрэнцыя з акадэмічна адстапымі таварышамі

Для атрыманьня літару з 50 проц. скідкай па чыгунцы, усім студэнтам да вызначанага тэрміну неабходна наведаміць рабфак аб прыезьдзе на канфэрэнцыю або іспыты. Адначасова паведаміць чыгуначную станцыю з якой патрэбна выяжджаць, (палустанак і разьезд вызначыць ня трэба).

Нам. дэкана рабфаку ЯКАЎЛЕЎ

ВЫШЛА З ДРУКУ,

рассылаецца падпісчыкам і прадаецца ў кнігарнях

„УЗВЫШША“ № 2

ЗЬМЕСТ НУМАРУ:

Зьмітрок Бядуля.—Плылі дні (аповесьць).
Пятро Глебка.—Арка над акіянам (паэма).
А. Троецкі.—Старасельшчына (аповесьць).
Ю. Віцьбіч.—Янак Гай (апавяданьне).
Крапіва.—Плач абыватэля (вершы).
В. Вольскі.—Падарожнае (нарыс).
А. Плятун.—Нацыянальна - культурнае будаўніцтва БССР.

Яшчэ ня позна падпісацца на „УЗВЫШША“ на ўвесь год; нумары, якія ўжо вышлі, высылаюцца падпісчыкам адразу.

Адрас: Менск, Савецкая, 68, „Узвышша“.

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты да 2 гадзіны дня

Друкарня газэты «Зьвязда», Менск. Менск, Галоўлітбел № 337